# ПАБУДУЕМ НОВАЕ, ЗБЕРАЖЭМ ЛЕПШАЕ

## ПРАГРАМА
## кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Ярослава РАМАНЧУКА



У Беларусі многае трэба захоўваць і прымнажаць. У першую чаргу, гэта чалавечы патэнцыял. Нашы людзі — разумныя, працавітыя, адукаваныя, выхаваныя, з еўрапейскім стаўленнем да закона. Іх ініцыятыва — крыніца эканамічнага развіцця.

Але імкненне цяперашняга кіраўніцтва краіны паўтарыць савецкі вопыт, які ў свой час прывёў да развалу Савецкага Саюза, паставіла беларускую эканоміку на мяжу выжывання. Не можа працвітаць краіна, дзе падаўляецца ініцыятыва людзей.

Абсталяванне і тэхналогіі беларускіх прадпрыемстваў устарэлі і не могуць вырабляць канкурэнтаздольную прадукцыю. Яны сталі пагрозай для жыцця рабочых і экалогіі краіны. Прыватная ўласнасць не абаронена, што адпужвае інвестараў. Бізнэс задушаны вялізнай колькасцю кантралюючых органаў, праверкамі, падаткамі. Сёння беларус за ўсё сваё жыццё пры сярэдняй зарплаце плаціць $75 тысяч падаткаў. Гэта значыць, сярэдні беларус павінен 16 гадоў, 40 % усяго працоўнага жыцця, адпрацаваць на падаткі.

Кантрактная сістэма пазбаўляе работніка права голасу, над ім пастаянна вісіць пагроза звальнення. Чалавек не абаронены ад чыноўніка. Службоўцы вымушаныя рыхтаваць вялікую колькасць бессэнсоўных дакументаў. Медыцыну і адукацыю «бясплатнымі» можна назваць толькі ўмоўна. Улада адабрала ў інвалідаў, пенсіянераў і дзяцей апошнія льготы.

Насельніцтва Беларусі скарачаецца. Падае прэстыж працы беларусаў. Кожны пяты беларус марыць з'ехаць з Беларусі. Гэта катастрафічны вынік развіцця краіны!

Афіцыйныя СМІ запэўніваюць, што ў суседзяў яшчэ горш. Давайце параўнаем. У нас павышэнне зарплаты адразу «з'ядаецца» ростам цэн. А ў Польшчы сярэдняя зарплата амаль 1500 долараў. У сярэднім паляк за зарплату за 6,5 года працы можа купіць кватэру. У Беларусі ж на кватэру трэба працаваць больш як 14 гадоў.

Іншы прыклад — Славакія. Невялікая краіна, якая не мае сваіх нафты і газу. Але славакі паверылі ў дэмакратыю, правялі прыватызацыю, вызвалілі гандаль, знізілі падаткі. Цяпер экспарт Славакіі на душу насельніцтва ў 4,5 раза больш, чым у Беларусі, а жыхары Славакіі жывуць на 5 гадоў даўжэй, чым беларусы. А яшчэ дваццаць гадоў назад у нас з імі былі практычна аднолькавыя пазіцыі.

Неабходнасць рэформаў разумеюць нават сённяшнія ўлады. Яны бяруць некаторыя палажэнні маёй праграмы, але ў іх нічога не атрымліваецца. Чаму? Таму што рэфармаваць эканоміку, не мяняючы пры гэтым стаўлення да чалавека і грамадства, немагчыма. Нельга разлічваць на прыход інвестараў, не забяспечыўшы абарону прыватнай уласнасці. Нельга чакаць павелічэння паступленняў у бюджэт, не даўшы чалавеку сумленна зарабіць сваёй працай. Нельга патрабаваць ад моладзі заставацца ў краіне, не стварыўшы ёй умоў для рэалізацыі сваіх здольнасцяў на Радзіме. Нельга патрабаваць ад жанчын нараджаць больш, не гарантаваўшы іх сем'ям годныя ўмовы жыцця.

Я не толькі разумею неабходнасць змен, але і ведаю, як іх ажыццявіць у інтарэсах людзей і краіны. Мая праграма створана не на голай тэорыі, а ў працэсе абмеркавання з рабочымі, прадпрымальнікамі і кіраўнікамі прадпрыемстваў. Мая праграма — гэта Беларусь будучага, сучасная, еўрапейская краіна.

### МАЯ ПРАГРАМА ЗАСНАВАНАЯ НА ПЯЦІ ПРЫЯРЫТЭТАХ:

1. Новыя працоўныя месцы
2. Вялікае грамадства
3. Сумленная дзяржава
4. Прыватная эканоміка
5. Адкрытая краіна

### НОВЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ

За тры гады ў Беларусі будзе створаны мільён новых працоўных месцаў. Яны будуць ствараца нашымі прадпрымальнікамі, малым бізнэсам.

Для гэтага будуць адменены ўсе абмежаванні па найме, скасавана сістэма кароткатэрміновых кантрактаў. Замест іх будуць выкарыстоўвацца бестэрміновыя дагаворы з дакладным апісаннем правоў і абавязкаў наймальнікаў і наёмных работнікаў.

Сотні тысяч работнікаў будуць занятыя на мадэрнізацыі інфраструктуры. На развіццё дарог, энергетычнай сістэмы, водазабеспячэння, сістэмы ацяплення штогод будзе накіроўваецца $2,5 млрд.

Жыллёвае пытанне для працоўнай і навучэнскай моладзі будзе вырашаецца за кошт будаўніцтва сучасных інтэрнатаў. На гэта штогод будзе выдзяляцца $500 млн. Будзе прадугледжана права выкупу пакоя або блока. Іх можна будзе выкарыстоўваць у якасці залогу для атрымання жыллёвага крэдыту.

На дынамічным рынку працы максімальна спрошчанай будзе працэдура найму на працу. Наймальнік і наёмны работнік атрымаюць права самастойна вызначаць рэжым, час і ўмовы працы, а таксама парадак і формы аплаты працы.

### ВЯЛІКАЕ ГРАМАДСТВА

Вялікае грамадства — гэта кантроль грамадзян над дзяржавай, а не наадварот, як цяпер. Усе палітыкі ва ўладзе будуць выбірацца, а не прызначацца. 70% дзяржбюджэту будзе траціцца на мясцовым узроўні. Будзе ліквідавана цэнзура СМІ, гарантавана свабода слова і суверэнітэт Інтэрнэта.

Новая Беларусь будзе здаровай. Мы прадаставім медыцынскую страхоўку за кошт дзяржавы інвалідам, ветэранам і шматдзетным сем'ям. Вернем ільготы інвалідам і пенсіянерам. Лекі стануць таннейшымі за кошт адмены пошлін і падаткаў на імпартныя прэпараты і медыцынскае абсталяванне. Чэргі ў паліклініках рэзка скароцяцца за кошт павелічэння колькасці ўрачоў, таму што іх зарплата будзе істотна павышана. Прыярытэтам будзе масавая фізкультура.

Вялікае грамадства — гэта грамадства адукаваных людзей. Зарплата школьных настаўнікаў вырасце. Яны будуць вызвалены ад усяго, што не звязана з вучэбным працэсам. Універсітэты атрымаюць шырокую аўтаномію. Будзе скасавана прымусовае размеркаванне. Павышэнне кошту навучання ў ВНУ будзе магчымым толькі з ухвалення студэнцкага савета.

Адной з найважнейшых задач з'яўляецца захаванне нашай беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці. Мы будзем захоўваць і развіваць нашу нацыянальную культуру і мову. Мы пойдзем у будучае, улічваючы ўрокі нашай гісторыі.

Вялікае грамадства будзе ганарыцца абаронцамі айчыны. Беларусь пяройдзе на прафесійную армію. Мы правядзём рэформу міліцыі, якая будзе ахоўваць закон, а не пераследаваць грамадзян за іх погляды.

Будуць праведзены праверкі па ўсіх скаргах на незаконныя і несправядлівыя пастановы судоў.

Мы кампенсуем урон тым грамадзянам, якія ў перыяд 1996—2010 гг. былі асуджаныя, звольненыя, выключаныя з ВНУ, аштрафаваныя за дазволеную Канстытуцыяй палітычную і грамадзянскую дзейнасць.

### СУМЛЕННАЯ ДЗЯРЖАВА

На працягу года пасля выбараў мы правядзём рэферэндум, каб аднавіць вяршэнства Закона, падзел уладаў і паставіць чыноўнікаў пад грамадзянскі кантроль. Абмяжуем тэрмін паўнамоцтваў прэзідэнта (2 разы па чатыры гады).

У Беларусі будзе выбраны паўнацэнны парламент, гарантавана незалежнасць і эфектыўнасць суда. Кіраўнікі гарадоў і раёнаў будуць выбірацца, а не прызначацца. Дэмакратычныя выбары ў парламент і ўсе мясцовыя органы ўлады пройдуць вясной 2012 года.

У рабоце над рэформай сілавых структур, аховы здароўя і адукацыі актыўны ўдзел возьме грамадзянскае грамадства. Адпаведныя законы будуць прыняты дэмакратычным парламентам.

### ПРЫВАТНАЯ ЭКАНОМІКА

Беларусь стане адным з лепшых месцаў для прадпрымальніцтва ў Еўропе. Будзе ўведзеная адзіная мытная пошліна на ўсе імпартныя тавары ў памеры 3%. Замест 30 падаткаў і збораў будзе толькі тры: падатак з рознічных продажаў тавараў і паслуг (20%), адзіны сацыяльны падатак (15%) і акцызы. Падатковыя зборы не будуць перавышаць 30% ВУП. За кошт спрашчэння справаздачнасці на руках у прадпрыемстваў штогод будуць дадаткова заставацца больш як $3 млрд.

Мы правядзём сумленную прыватызацыю ў інтарэсах грамадзян Беларусі. Яе сутнасць у наступным: 60% паступленняў ад продажу дзяржмаёмасці — у Пенсійны фонд, на інвеставанне, а не праяданне. 10% акцый бясплатна атрымаюць работнікі гэтых прадпрыемстваў. 25% акцый усіх стратэгічных прадпрыемстваў будзе перададзена ў Пенсійны фонд. Празрыстасць прыватызацыі дазволіць не дапусціць у краіну крыміналу і капіталу, які пагражае суверэнітэту краіны.

Мы пойдзем насустрач людзям і аформім непрыватызаваныя кватэры ў прыватную ўласнасць грамадзян, калі яны пражываюць у іх больш як 10 гадоў.

Будзе ліквідавана практыка канфіскацыі маёмасці, арышту і спісання грошай з рахункаў без рашэння суда. На 2011—2012 гг. будзе ўведзены мараторый на праверкі прадпрымальнікаў і малога бізнэсу.

Цэны будуць свабодныя і стабільныя. Банкі і фінансавая сістэма Беларусі будуць строга захоўваць міжнародныя стандарты, каб гарантаваць захаванасць укладаў.

### АДКРЫТАЯ КРАІНА

Галоўны прынцып новай знешняй палітыкі — прыярытэт інтарэсаў грамадзян Беларусі. Мы будзем выбудоўваць партнёрскія ўзаемавыгадныя адносіны з Расіяй, Украінай, краінамі ЕС. Мы падтрымаем паўнацэнны навуковы, культурны і інфармацыйны абмен паміж Беларуссю і іншымі краінамі.

Да 2013 года Беларусь выканае ўсе патрабаванні СГА і стане яе членам. Наша краіна стане членам Савета Еўропы.

Да 2013 года Беларусь уступіць у зону свабоднага гандлю з Еўрапейскім Саюзам. Наш дэмакратычны ўрад будзе весці работу па адмене віз у краіны ЕС.

Беларуская нацыянальная культура ўзбагаціць еўрапейскую і стане яе неад'емнай часткай.

### ПРАГРАМЫ БУДУЦЬ ВЫКОНВАЦЦА ЗА КОШТ НАСТУПНЫХ РЭСУРСАЎ:

**1.** Знешнія інвестыцыі. Інвестары гатовыя ўкладваць грошы ў Беларусь, але пры ўмове правядзення разумнай і збалансаванай палітыкі. Пад маю праграму гатовыя інвеставаць Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця, Аўстрыя, Канада і іншыя краіны. Ужо сёння можна сказаць, што пад маю праграму да 2014 года ў краіну будзе прыцягнута да $20 млрд прамых замежных інвестыцый.

**2.** Скарачэнне выдаткаў на дзяржапарат. Гэта дазволіць зменшыць выдаткі бюджэту, як мінімум, на $1млрд у год.

**3.** Рэформа падатковай сістэмы. Скарачэнне колькасці падаткаў, змяншэнне іх ставак павысіць збіральнасць падаткаў. У выніку паступленні ў бюджэт павялічацца, з цянявой эканомікі выйдзе каля $8 млрд.

Грошы на рэформы таксама з'явяцца за кошт развівалення прадпрымальнікаў і творчага патэнцыялу грамадзян, адмовы ад бессэнсоўных будаўнічых праектаў, вызвалення бюджэту ад неабходнасці датавання стратных прадпрыемстваў.

Але галоўным рэсурсам будуць людзі, гатовыя зарабляць самі і даваць зарабляць іншым, якія паважаюць сябе, свой народ і сваю краіну.

Беларусі патрэбны прафесіяналы.

Разам мы

**ПАБУДУЕМ НОВАЕ, ЗБЕРАЖЭМ ЛЕПШАЕ!**

# РАДЗІМА. ГОНАР. НАРОД.

## ПЕРАДВЫБАРЧАЯ ПРАГРАМА
## кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь СТАТКЕВІЧА М. В.



Дарагія суайчыннікі!

Звяртаюся да Вас, як кандыдат у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і Ваш зямляк, афіцэр.

Звяртаюся да Вас, як прадстаўнік сацыял-дэмакратычнага руху, як грамадзянін, які жыве ў гэтай краіне і бачыць разам з Вамі яе праблемы і дасягненні.

Ёсць гэтыя дасягненні? Глядзячы з чым іх параўноўваць. А вось праблемы нашай дзяржавы, нашыя з вамі праблемы занадта відавочныя, каб іх не заўважаць.

Буду з вамі сумленным.

Не сакрэт, што ўлада збіраецца фальсіфікаваць гэтыя выбары, як і ўсе мінулыя.

Цяперашні кіраўнік дзяржавы вельмі баіцца згубіць уладу, якую ён сабе прысвоіў. Мерапрыемства пад назвай «прэзідэнцкія выбары» скончыцца, хутчэй за ўсё, як звычайна. Дыктары абвесцяць Вам узятыя са столі лічбы, якія сведчаць аб «безумоўнай падтрымцы прэзідэнта беларускім народам». Альтэрнатыўным кандыдатам адведзена роля статыстаў у гэтым спектаклі.

Узнікае пытанне, чаму я ўдзельнічаю ў гэтых выбарах?

Адказваю.

Прэзідэнцкая кампанія — гэта адна з рэдкіх магчымасцяў звярнуцца да выбаршчыкаў праз дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі. Людзі павінны ведаць, што існуе альтэрнатыва таму, што яны бачаць штодня на экранах тэлевізараў. Акрамя таго, каб сумленныя і празрыстыя выбары ў рэшце рэшт адбыліся, за гэта трэба змагацца.

Аднаму мне гэтага немагчыма дамагчыся. Мне патрэбна Ваша падтрымка, дарагія суайчыннікі. Што мы разам можам зрабіць, каб перашкодзіць сфальсіфікаваць выбары?

— Адмовіцца ад удзелу ў папярэднім галасаванні. Выбарчыя скрыні на гэтым этапе назіральнікі могуць кантраляваць толькі некалькі гадзін у суткі.

— Абавязкова прагаласуйце, але толькі 19 снежня, у дзень выбараў. Інакш Ваш голас выкарыстаюць за Вас.

— Вы можаце сабраць 10 подпісаў сярод суседзяў і стаць назіральнікам на сваім выбарчым участку.

— Дамагацца, каб камісія лічыла бюлетэні публічна, працэс падліку быў адкрыты для назіральнікаў.

— Прымаць удзел у масавых мерапрыемствах альтэрнатыўных кандыдатаў, каб аказаць уплыў на ўладу і прымусіць яе дэмакратызаваць выбарчы працэс.

Тое, што, з майго пункту гледжання, абавязаны зрабіць дэмакратычна абраны прэзідэнт Беларусі.

### АДУКАВАНАЯ НАЦЫЯ ПАВІННА ГЛЯДЗЕЦЬ У БУДУЧЫНЮ

Вялікі англійскі мысліцель Джон Локк неяк сказаў: будучыня ёсць у таго народа, якому ўрад дае магчымасць падняць вочы і паглядзець наперад. А ў нашых дзяцей ёсць такая перспектыва?

Я выгадаваў і выхаваў двух дачок. Мне, як бацьку, блізкія і зразумелыя праблемы сучаснай моладзі і іх бацькоў.

Рэформа сярэдняй адукацыі, якую нядаўна пачыналі цяперашнія кіраўнікі, прывяла да таго, што беларуская сярэдняя адукацыя ўпала на некалькі ступеняў уніз. Яна скіравана на тое, каб думаючых, актыўных дзяцей пазбавіць магчымасці паступіць у ВНУ. У найгоршых традыцыях Савецкага Саюза для паступлення на прэстыжныя факультэты патрэбны рэкамендацыі мясцовых выканкамаў.

У выніку гэтай, з дазволу сказаць, «рэформы», рэзка ўзрасла колькасць самазабойстваў сярод вучняў.

Хто за гэта адказа?

Чаму міністр адукацыі Радзькоў да гэтай пары займае сваю пасаду?

Чаму ніхто не прыцягнуты да адказнасці за гэтыя непісьменныя эксперыменты на нашай моладзі?

Склалася парадаксальная сітуацыя:

Канстытуцыя краіны гарантуе права на бясплатную адукацыю. Але ў рэальнасці існуе заганная практыка, калі шасцёра студэнтаў з дзесяці плацяць за вучобу. Далёка не ўсім здольным маладым людзям, асабліва з вёсак і малых гарадоў, гэта па кішэні. Адукацыя павінна быць для разумных, а не толькі для багатых.

Тых, каму пашчасціла паступіць у ВНУ на бюджэтнай аснове, чакае прымусовае размеркаванне. Не сакрэт, што маладых педагогаў і медыкаў часта размяркоўваюць у раёны, забруджаныя аварыяй на ЧАЭС. А гэта — генафонд нацыі.

**Нам, еўрапейскай дзяржаве, неабходна прывесці сярэднюю і вышэйшую адукацыю ў адпаведнасць са стандартамі Еўразвяза.**

**Дзяржава павінна стымуляваць імкненне маладых людзей атрымаць якасную адукацыю, у тым ліку і за мяжой.**

**Прымусовае размеркаванне выпускнікоў ВНУ павінна быць ліквідавана як форма ўзаконенага прыгоннага права.**

### ЭКАНОМІКА РОЗУМУ

Нам дасталася ў спадчыну з савецкіх часоў дастаткова сучасная эканоміка, дзесяткі, калі не сотні тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Не шмат у каго з нашых суседзяў на пачатку 90-х былі такія добрыя стартавыя ўмовы.

На жаль, цяперашняя ўлада нічога не зрабіла, каб выкарыстаць гэты патэнцыял. За дваццаць год большасць вытворчых магутнасцяў знасілася, мала надзяляецца ўвагі падрыхтоўцы маладой змены. Атрыманыя крэдыты і датацыі ад Расіі праядаліся і скарыстоўваліся для прыкормкі прыдворнага бізнэсу.

Элементарны здаровы сэнс падказвае, што эканоміцы, прамысловасці патрэбна мадэрнізацыя. Краіне неабходны інвестыцыі, новыя тэхналогіі. Але ў каго з'явіцца жаданне ўкладваць грошы ў эканоміку дзяржавы, якая заўтра можа забраць ва ўласніка ўсю яго маёмасць, як ужо не раз бывала?

Бясспрэчная залежнасць ад працадаўцы — чарговая праблема працаўнікоў бюджэтнай сферы. З дапамогай кантрактнай сістэмы людзей прымушаюць падпарадкоўвацца і паслухмяна цярпець парушэнне іх права на нармальную працу і годнае жыццё.

**Неабходна рэфармаваць заканадаўства так, каб людзі маглі спакойна працаваць і сумленна плаціць падаткі.**

**Кантрактная сістэма павінна быць ліквідавана.**

**Замежным інвестарам, якія гатовы развіваць у нашай краіне высокатэхналагічныя вытворчасці, павінны быць прадстаўлены падатковыя льготы і дзяржаўныя гарантыі захоўвання іх правоў на ўласнасць.**

### ТВАРАМ ДА ЛЮДЗЕЙ

Па выніках сацапытанняў толькі 22 працэнты нашых грамадзян ацэньвае сваё матэрыяльнае становішча як задавальняльнае.

Напэўна, Вы кожны дзень назіраеце высокапастаўленых чыноўнікаў. Дакладней, іх абыякавасць, хамства, дарагія машыны і ўласныя дамы за высокім плотам. Складваецца ўражанне, што гэта каста жыве ў нейкай іншай краіне, якая існуе толькі на экране тэлевізара.

У той час мільёны простых, працавітых і цярплівых беларусаў ледзьве зводзяць канцы з канцамі, атрымліваюць мізэрныя заробкі і пенсіі. Мільёны забытых уладай людзей. Уладай, якую яны не выбіралі.

Афіцыйная прапаганда сцвярджае, што беспрацоўных у нас практычна няма. На самай справе, беспрацоўным проста няма сэнсу рэгістравацца ў цэнтрах занятасці, таму што дапамога па беспрацоўю складае максімум 70 000 рублёў.

Мне, як грамадзяніну Беларусі, сорамна за гэтую ўладу.

**Выбраныя падчас сумленных выбараў органы ўлады павінны забяспечыць годны ўзровень жыцця кожнаму грамадзяніну нашай краіны.**

**Павінны быць вернуты льготы сацыяльна неабароненым слаям насельніцтва, пенсіі і дапамога па беспрацоўю — жорстка прывязаны да ўзроўню сярэдняга заробку.**

**Улада, у адпаведнасці з Канстытуцыяй, павінна быць падкантрольнай народу. Гэтага можна дамагчыся шляхам сумленных і празрыстых выбараў. Для гэтага неабходна змяніць выбарчае заканадаўства так, каб галасы выбаршчыкаў, Вашы галасы, сапраўды лічылі.**

**Хацелася б нагадаць дзейнай уладзе словы Франкліна Дэлано Рузвельта: «Калі вы хочаце ацалець — праводзьце рэформы».**

### СТАТКЕВІЧ Мікалай Віктаравіч

#### БІЯГРАФІЯ КАНДЫДАТА Ў ПРЭЗІДЭНТЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Кандыдат тэхнічных навук, спецыяліст у галіне кіравання. Падпалкоўнік запаса. Нарадзіўся 12.08.1956 г. у Слуцкім раёне ў сям'і настаўнікаў.

Закончыў Мінскае вышэйшае інжынернае зенітнае ракетнае вучылішча. Служыў у Запаляр'і. Абараніў кандыдацкую дысертацыю і выкладаў у МВІЗРВ.

У 1993 годзе публічна выступіў супраць Дамовы аб калектыўнай бяспецы з ваюючымі краінамі (Арменія, Таджыкістан і інш.), па ўмовах якой Беларусь павінна была адпраўляць сваіх салдат на чужыя войны. За гэта быў звольнены з войска за месяц да планаванай абароны доктарскай дысертацыі.

Пасля шырокай грамадскай кампаніі ў падтрымку яго патрабаванняў беларускі парламент падпісаў дадзеную дамову з умовай не пасылаць нашых салдат у «гарачыя кропкі».

Актыўна заняўся палітыкай. У 1996 г. быў абраны старшынёй Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада), якая абараняе інтарэсы людзей працы, пенсіянераў, малога бізнэсу і моладзі.

Лідэр барацьбы за незалежнасць нашай краіны. Арганізаваў і ўзначаліў дзясяткі шматтысячных дэманстрацый у абарону дэмакратыі і суверэнітэту. Шмат разоў арыштоўваўся, супраць яго былі заведзены крымінальныя справы. У знявoлені трымаў доўгатэрміновыя галадоўкі. 2 гады правёў на «хіміі». У 1999 годзе ўзначаліў 50-тысячны Марш Свабоды, пасля чаго спыніліся выкраданні і забойствы палітыкаў, гандаль незалежнасцю краіны.

З 2003 г. узначальвае Еўрапейскую кааліцыю, у якую ўваходзіць шэраг партый, прафсаюзных, жаночых і маладзёжных арганізацый. Аўтар многіх работ у галіне палітыкі, міжнародных адносін. Вылучаны кандыдатам у прэзідэнты Кангрэсам «Еўрапейскай кааліцыі», у якім брала ўдзел больш за 700 дэлегатаў.

Вырасціў і выгадаваў двух дачок.

Сайт у глабальнай сетцы Інтэрнет www.statkevich.org

1
СНЕЖНЯ
2010 г.
СЕРАДА
№ 45 (15648)
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Фота прадастаўлена добраахвотніцкай асацыяцыяй «Кавала б'янка».



Выхаванцы Бягомльскай дапаможнай школы-інтэрната ў Італіі, возера Бальсэна, 2002 год. Гэта так званае 2-е аддзяленне, або самыя «цяжкія» дзеці, якіх ніхто з Італіі, акрамя добраахвотніцкай асацыяцыі «Кавала б'янка», ніколі не запрашаў. Разам з імі і родная дачка старшыні асацыяцыі Гаі Карлеці (дзяўчынка з паднятым дагары рукамі).

# БЕЛАРУСЬ — ІТАЛІЯ — ДЗЕЦІ

## ЧАСТКА І. Гісторыя непаразумення

**(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 29 лістапада.)**

— Справа ў тым, што «Дом Пінокіа» знаходзіўся на балансе школы-інтэрната, а жылі там маладыя людзі, якія ўжо ніяк не маглі адносіцца да нашай навучальнай установы, бо былі старэйшыя за 18 гадоў, — тлумачыла журналісту «Звязды» **дырэктар дапаможнай школы-інтэрната Таццяна ПРАДЗЕД**. — Некаторы час на гэта ніхто не звяртаў увагі, але пры чарговай праверцы высветлілася, што гэта — грубае парушэнне. Вось тады раённаму аддзелу адукацыі нічога не заставалася, як хутчэй закрыць «Дом Пінокіа».

Таццяна Анатольеўна прызналася, што дагэтуль праект знаходзіцца ў неакрэсленым стане. З лета 2008 года будынак, за які былі заплачаны немалыя дабрачынныя грошы, не выкарыстоўваецца і прыйшоў у заняпад. Выпускнікі школы-інтэрната сёння жывуць у чатырох прыватных дамах, якія ім купілі італьянцы. Некалькі разоў на год італьянцы прыязджаюць іх праведаць, закупляюць прадукты, аплачваюць камунальныя паслугі, а таксама пераводзяць грошы і на асабістыя пластыкавыя карткі маладых людзей...

Некаторы час за дарослымі дзецьмі па просьбе італьянцаў прыглядала былая намеснік дырэктара школы-інтэрната, цяпер ужо без атрымання за гэта заробку, бо пасля ліквідацыі «Дома Пінокіа» скарочаны быў і штат яго выхавацеляў (заробак якім, нагадаем, налічвала асацыяцыя «Кавала б'янка»). Гэты чалавек дапамагаў маладым людзям уладкавацца на працу, кантраляваў іх фінансы і расход прадуктовых запасаў, дапамагаў у вырашэнні іншых праблем. Аднак падобна на тое, што такі стан спраў зусім не задавальняў мясцовыя ўлады.

— Атрымлівалася, што фінансаванне праекта ідзе праз канкрэтнага чалавека, а адказвае раён, — тлумачыў **начальнік аддзела адукацыі Докшыцкага райвыканкама Аляксандр ІЛЬЯСЕВІЧ**. — Нам грошы не патрэбныя, але мы павінны мець магчымасць кантраляваць, як распараджаецца грашыма той, хто іх атрымлівае. Каб папярэдзіць злоўжыванні і ўмець адказаць на пытанні і саміх выпускнікоў, і італьянцаў.

— Мы, як мясцовая ўлада, павінны глядзець, чаму, напрыклад, да нашых дзяцей — грамадзян Рэспублікі Беларусь — прыязджаюць італьянцы? — выказваў пазіцыю адміністрацыі раёна **намеснік старшыні Докшыцкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях Міхаіл МАРКАВЕЦ**. — Выпускнікі інтэрната — гэта не толькі жыхары раёна, але і грамадзяне Беларусі. Таму мы не можам заставацца ўбаку. Мы за тое, каб зрабіць праект празрыстым, прывесці яго ў адпаведнасць з нашым заканадаўствам. Каб цэнтр адаптацыі стаў дзяржаўнай структурай, каб у ім працавалі людзі, з якіх можна спытаць. Нас не задавальвае, што праект працуе і, разам з тым, не працуе.

### Гісторыя ПЕРАКЛАДання

Тым не менш, з лета 2008 па вясну 2010-га мясцовыя ўлады якраз-такі былі ўбаку ад праекта і лёсам дарослых дзяцей не цікавіліся. Італьянцы, як толькі даведаліся пра немагчымасць пакінуць «Дом Пінокіа» ў структуры раённага аддзела адукацыі, папрасілі аб сустрэчы з раённымі сацыяльнымі службамі, каб унесці ў праект неабходныя карэктывы. Аднак сацыяльныя службы Докшыцкага раёна паставілі некалькі ўмоў, якія, мякка кажучы, прывялі італьянскі бок у стан разгубленасці.



Коля і Сяргей. Фота зроблена ў пачатку 2000-х гадоў у Бягомльскай школе-інтэрнаце. Пасля выпуску шляхі сяброў разышліся: Коля быў накіраваны ў Багушэўскі дом інвалідаў, але трапіў у праект «Пінокіа», а Сяргей паехаў вучыцца ва Улу, дзе хутка быў асуджаны за крадзеж. Калі «Дом Пінокіа» закрылі, Коля адшукаў сястру і паехаў да яе. Але жыццё там не склалася, ён вярнуўся у Бягомль, пасяліўся ў доме, купленым італьянцамі. Гэтым летам у складаную сітуацыю, звязаную з крадзяжом, патрапіў і ён. А днямі згарэў дом, у якім жыў ён і яшчэ тры чалавекі...

— Мы сказалі, што прымем на свой баланс «Дом Пінокіа» толькі пасля рамонту і прывядзення ў парадак тэрыторыі, — узгадвае **дырэктар Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Докшыцкага раёна Марыя КУРДЭКА**. — Мы назвалі італьянцам неабходную для гэтага суму, не такую ўжо і вялікую, але яны падумалі і адмовіліся, спаслаўшыся на крызіс.

«Невялікая» сума, якую запатрабаваў Тэрытарыяльны цэнтр, складала 95 мільёнаў рублёў — летам 2008 года гэта раўнялася амаль 45 тысячам долараў. Для італьянцаў, якія чатыры гады таму (усяго толькі!) купілі гэты самы дом за 14 тысяч долараў, рэканструявалі, адрамантавалі і абсталявалі яго яшчэ за 15 тысяч еўра — гэта была ВЕЛЬМІ вялікая сума.

Каб лепш зразумець гэта, трэба трошкі больш падрабязна спыніцца на фінансавым баку справы. З 2004 года па сённяшні дзень «Кавала б'янка» выдаткавала на дзяцей Бягомля каля 150 тысяч еўра, або ў сярэднім па 25 тысяч еўра ў год. Усе гэтыя грошы праведзены праз Дэпартамент па гуманітарнай дапамозе, дабрачынны рахунак у «Беларусбанку», бухгалтэрыю школы-інтэрната, таму цалкам празрыстыя. Так сцвярджаюць і італьянцы, і былы дырэктар школы-інтэрната, а таксама куратар праекта з беларускага боку.

Пры гэтым усе італьянцы, якія прыязджалі ў Беларусь (уключаючы псіхолага, псіхатэрапеўта, этнолага, спецыяліста па псіхаматорыцы, тэатральнага і кінарэжысёра, спецыяліста па анімацыйнай творчасці) удзельнічалі ў праекце на добраахвотных пачатках і бязвыплатна. Пра што паведаміла «Звяздзе» старшыня добраахвотніцкай асацыяцыі Гая Карлеці: «Ніводны італьянец не атрымоўваў ніколі грошай за ўдзел у праекце».

Нагадаем, што ўласных грошай у «Кавала б'янка» няма — размова ідзе пра сабраныя дабрачынныя сродкі і ахвяраванні. Акрамя таго, добраахвотніцкая асацыяцыя двойчы запрашала маладых удзельнікаў праекта ў Італію для культурнага абмену і ўдзелу ў тэатральных прадстаўленнях, кожны раз гэта каштавала каля 10 тысяч еўра. Нарэшце, «Кавала б'янка» з 2002 па 2006 год за свой кошт прымала ў Італіі самых цяжкіх дзяцей з інтэрната, з якімі праводзіліся заняткі па творчым развіцці, самавыяўленні і рэабілітацыі. Гэта яшчэ каля 10 тысяч еўра на кожную паездку, наём спецыялістаў і выдаткі на спектаклі...

Я спытала ў дырэктара Докшыцкага тэрытарыяльнага цэнтра, ці гатовы быў раён частку выдаткаў па рамонце і перадачы «Дома Пінокіа» з адной структуры ў іншую ўзяць на сябе? На што Марыя Курдэка паціснула плячыма:

— Праект жа патрэбны італьянцам, дык чаму мы павінны за яго плаціць?

— Дзеці ж — нашы!

— Ну не проста ж так «Кавала бьянка» ўсё гэта робіць! Нешта яна ад гэтага мае.

Безумоўна, у некаторых з нашых чыноўнікаў (якія, між іншым, па спецыфіцы сваёй справы абавязаны клапаціцца пра сацыяльна неабароненых людзей!) у галовах не ўкладваецца, як магчыма бескарыслівa клапаціцца пра разумова адсталых сірот з іншай краіны. Думаю, у гэтым хаваецца галоўная прычына прыпынення праекта — італьянцы нашых дзяцей любяць, а некаторыя з нашых — не. І апошнім уся гэта важданіна вакол дзяцей незразумелая. Для іх гэта толькі галаўны боль. Куды прасцей выпусціць дзяцей са школы-інтэрната і адправіць туды, адкуль яны калісьці былі прывезеныя. Няма дзяцей — няма праблем.

— Былі б італьянцы альбо не, падлеткі былі б жыллём забяспечаныя, — сказаў Аляксандр Ільясевіч. — Іншая справа, што яны атрымалі б жыллё не ў Бягомлі, а там, адкуль прыехалі. Дык гэта і няправільна — пакідаць у Бягомлі ўсіх дзяцей, якія прыехалі ў школу-інтэрнат з усёй вобласці.

### Гісторыя адрозненняў

Падчас размовы з прадстаўнікамі мясцовай улады ў мяне ўзнікла ўражанне, што ў адміністрацыі раёна многія і сёння цьмяна ўяўляюць як сутнасць задуманага і часткова рэалізаванага італьянцамі праекта, так і тое, якія карэктывы ў яго неабходна ўнесці, каб працягнуць і пашырыць выкарыстанне ўнікальнага і, безумоўна, карыснага і цікавага для Беларусі вопыту інтэграцыі ў грамадства маладых людзей з псіхафізічнымі асаблівасцямі.

Выклікаў недавер былы куратар праекта, які цалкам задавальняў італьянцаў. Цяпер адміністрацыя сама вызначыла жанчыну-валанцёра, якая прыглядае за насельнікамі трох «моладзевых» дамоў у Бягомлі. Але як доўга і наколькі якасна гэтыя кантроль і дапамога будуць доўжыцца без стаўкі, заробку і прававога афармлення? Між тым, такі кантроль неабходны, з гэтым пагаджаюцца і Докшыцкі раённы аддзел адукацыі, і італьянцы.

Не вырашана пытанне і з аднаўленнем работы аддзялення адаптацыі і рэабілітацыі выпускнікоў Бягомльскай дапаможнай школы-інтэрната. Прычым, колькі людзей мне расказвалі пра гэту сітуацыю, столькі прычын, якія таму перашкаджаюць, называлася.

— Мы распрацавалі новы праект яшчэ два гады таму, як толькі паўстала пытанне аб перадачы яго ў нашу структуру, — тлумачыла «Звяздзе» **намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Віцебскага аблвыканкама Галіна ДЗЕМЧАНКА**, — Мы выдаткавалі вялікія грошы, каб разлічыць кошт рамонту, але італьянцы нечакана адмовіліся праект працягваць (грошы, якія раён выдаткаваў на разлік кошту рамонту, «Кавала б'янка» вярнула — **В.М.**). Разам з тым, мы вельмі ў праекце зацікаўленыя. Гэта добрая і патрэбная справа.

На жаль, дырэктар Докшыцкага тэрытарыяльнага цэнтра паказаць журналісту новы праект адмовілася, спаслаўшыся на тое, што гэта не канчатковы варыянт.

— Мы збіраемся стварыць аддзяленне, падобнае на аддзяленне дзённага знаходжання, якое ўжо існуе ў Докшыцах, — тлумачыў Міхаіл Маркавец. — Праект у нас ужо знаходзіцца ў высокай стадыі падрыхтоўкі. Думаю, дастаткова будзе яшчэ адной сустрэчы, каб яго запусціць з дапамогай італьянскага боку. Нам, дарэчы, жадаюць аказаць дапамогу і ірландцы. Яны таксама збіраюцца прыехаць.

— Размова ідзе пра аддзяленне толькі дзённага знаходжання? Або кругласутачнага?

— Гэта пытанне пакуль канчаткова не вырашана. Для кругласутачнага знаходжання патрэбны дадатковы штат. Магчыма, для пачатку варта адкрыць аддзяленне з дзённым знаходжаннем. А там паглядзім.

— Калі ваш варыянт праекта мае на ўвазе дзённае знаходжанне маладых людзей у цэнтры адаптацыі, дык куды яны будуць вяртацца ноччу?

— Будзем шукаць магчымасці знаходжання гэтых дзяцей кругласутачна...

Гэта размова адбылася ў верасні, а ў сярэдзіне кастрычніка італьянцы прыязджалі на чарговую сустрэчу з докшыцкімі ўладамі. Я прасіла запрасіць на перамовы з італьянцамі журналіста «Звязды», які спрабуе разабрацца ў сітуацыі. Намеснік старшыні райвыканкама паабяцаў, але так і не запрасіў.

### Гісторыя болю

— Цяжка сказаць, ці было разуменне сутнасці праекта з беларускага боку, — дыпламатычна адказала на пытанне «Звязды» Гая Карлеці. — Гэта таму, што часта, нават пры дапамозе перакладчыка, цяжка данесці ідэі, пра якія ніколі раней не гаварылася альбо не было сумеснага вопыту па іх рэалізацыі. Такім чынам, можа атрымацца так: нават калі абодва бакі мяркуюць, што маюць на ўвазе адно і тое ж, у сапраўднасці адзін бок надае большае значэнне адным аспектам праекта, а іншы — другім.

Летась асацыяцыя «Кавала б'янка» зняла фільм пра нашых дзяцей, які называецца «Фасфарылаза». Фасфарылаза — гэта фермент, які паскарае ў чалавечым арганізме далучэнне пэўнай малекулы да групы рэчываў. Без гэтага далучэння (свайго роду падрыхтоўкі) многія жыццёва важныя працэсы былі б немагчымыя. Мне ўдалося паглядзець гэты фільм, хоць **інспектар па ахове дзяцінства Докшыцкага раённага аддзела адукацыі Ганна САЎКОВІЧ** не раіла. Маўляў, ён чарніць нашу краіну. Але фільм аказаўся не пра гэта.

Магчыма, без перакладу не ўсё ў ім становіцца зразумелым. Але галоўнае перакладу не патрабуе. А галоўнае ў фільме тое, што яго героі — усе без выключэння — асобы. Гэта выпускнікі Бягомльскай дапаможнай школы-інтэрната. Сімпатычныя, цікавыя, неардынарныя. На іх не проста прыемна глядзець — яны адкрываюцца з нечаканага боку. Адкрываюцца самі і нешта адкрываюць гледачу. Фільм — пра ўдзельнікаў праекта «Пінокіа». Гісторыя любові. Гісторыя пошуку. Гісторыя болю за маладых людзей, якія для некага на гэтай зямлі назаўсёды застануцца дзецьмі.

Боль у фільме — адначасова светлы, бо змешаны з радасцю і гонарам; і глыбокі, які раздзірае душу, пазбаўляе пакою. Такі боль бывае за тых, каго любіш, за каго баішся. За вельмі блізкіх табе людзей. Не абавязкова родных.

«Фасфарылаза» — час затрымкі, павольнага дзеяння, якое неабходнае, каб знаходзіцца ў бясконцасці, — напісаў у сваёй рэцэнзіі да фільма рэжысёр Джавані Сансон. — «Фасфарылаза» — час, які неабходны любому чалавеку... для вяртання да сябе, для перажывання ўласнага жыцця. Без эканамічных абавязкаў працаваць ЗАРАЗ і любой цаной...»

«Вынікі, якія дасягнуў праект «Дом Пінокіа» — вялізныя, — лічыць Гая Карлеці. — Каб упэўніцца ў гэтым, дастаткова параўнаць лёс удзельнікаў праекта з лёсам тых, хто выйшаў з інтэрната і аказаўся сам-насам з рэаліямі жыцця... Мы ведаем, што толькі частку адказнасці за гэта можна ўскласці на мясцовую адміністрацыю, бо зусім не проста (нават у Італіі) працаваць з гэтымі хлопцамі і дзяўчатамі. Але сёння вельмі важна прыйсці сумесна з адміністрацыяй раёна да супрацоўніцтва, а не да супрацьстаяння. Добраахвотніцкая асацыяцыя «Кавала б'янка» хацела прапанаваць уласны аналагічны вопыт, але мы ніколі не дазволілі б сабе меркаваць аб працы, якую выканала беларуская адміністрацыя. Разам з тым, з абмену вопытам паміж нашымі народамі могуць нарадзіцца цудоўныя ідэі для агульнага дабра».

Італьянцы жадаюць супрацоўнічаць з адміністрацыяй Докшыцкага раёна і далей, дзеля нашых дзяцей. А мы?

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# КВАТЭРУ ЗА ІНТЫМ...

Выпрабавана на сабе



## ...Як я здавала

**«Здаваць кватэры за інтым у Беларусі? У нас такога не бывае», — думала я. Яшчэ летам у Байнэце мне трапляліся аб'явы такога кшталту. Аднак я і падумаць не магла, што попыт на іх такі высокі...**

Чацвер 18 лістапада. Палова на дванаццатую. Я кідаю на адзін з сайтаў аб'яву «Здам пакой за інтым. Насця» і нумар тэлефона.

Пятніца. Восем гадзін раніцы. Настойліва спрабую выключыць тэлефон, які жужукае. Ён не здаецца.

— Алё? — сонна пытаюся я.

— Гэта Саша. Я па аб'яве.

— Якой? — не магу даўмецца я.

— Ну, наконт кватэры за інтым, — не бянтэжыцца ён. — Я гатовы прапанаваць табе інтым і без кватэры.

— Пазваніце мне пазней, — толькі і змагла выціснуць з сябе я. Але гэта быў толькі пачатак.

Не паспела я паснедаць, як старэнькі «Нокіа» заціўкаў ізноў.

— Добры дзень, вы пакой яшчэ здаяце? — спыталі на тым канцы.

— Так.

— А хто там будзе жыць, акрамя мяне?

— Я. А вы самі адкуль?

— Я мінчанін. Жыву ў Зялёным лузе.

— Дык навошта вам кватэра? — здзіўляюся я.

— Я з бацькамі жыву. Хочацца асобна...

«Ага, асобна, але на халяву дзяўчыну і кватэру», — раздражнёна думаю я.

— І такія ўмовы вас цалкам задавальняюць? — пытаюся ўслых.

— Ну, так.

Па дарозе ў рэдакцыю тэлефон не змаўкаў. 36-гадовы Антон расказваў пра сваю дачку і жонку, з якой стала цяжка жыць. Як аказалася, кватэра яму не была патрэбна.

— Ты мне патрэбна, — рэзюмаваў хлопец.

Потым 19-гадовы юнак даслаў чатыры эсэмэскі кшталту: «А што, рэальна, за інтым?», «Колькі вам год?», «А што вы робіце сёння вечарам?».

На працы, адкрыўшы электронную скрыню, я знайшла тры лісты з просьбамі кшталту: «Прывітанне, Насця! Планую паездку ў Мінск на 1-2 дні... Магчыма, з сябрам. Я быў бы не супраць зняць пакой за інтым». Ці «Добры дзень! Насця, вы здаяце пакой за інтым? І колькі гэта будзе каштаваць?». Або «Дашлі сваё фота».

Агулам за пятніцу на маім мабільніку «засвяцілася» 10 нумароў, а на электроннай скрыні «вісела» чатыры лісты. І гэта пры тым, што аб'яву я давала толькі на адзін сайт. Адчуванне аленя, на якога накінуліся згаладалыя ваўкі.




За пяць дзён аб'яву прагледзелі 212 разоў.

### «Я першы раз збіраюся здрадзіць жонцы»

Каля ЦУМа Дзяніс прыпаркаваўся на серабрыстай «Аўдзі». З салона выйшаў хлопец росту з мяне (каля 172 см). Апрануты ў чорную куртку, сінія джынсы, такі ж світар, ён усміхнуўся. І тут жа паказаліся ямачкамі на шчоках і зморшчынкі ў кутках вачэй.

— Вось і я. Дзяніс. Можа, прысядзеце ў машыну? — і мужчына гасцінна памкнуўся адчыніць мне дзверы.

— Давайце на нейтральнай тэрыторыі, — астудзіла яго я.

— Добра. Якія ў вас умовы?

— Разумееце, я працую праваднiцай. У мяне часта бываюць камандзіроўкі, таму мне патрэбен чалавек, які будзе прыглядаць за маёй кватэрай. Ну, і аплата адпаведна інтымам, — бойка расказваю толькі што прыдуманую легенду. — Спадзяюся, што ні п'яных дэбошаў, ні вэрхалу там не будзе...

— Не-не. Што вы! — пераконвае мяне Дзяніс. — Я працую менеджарам у кампаніі. Уся садавіна сталіцы — гэта мы.

— А колькі вам год?

— Трыццаць два.

— Жанаты? — паглядзеўшы на рукі, спыталася я.

— Так. Ужо другі раз, — адказаў Дзяніс, але пярсцёнка я не заўважыла.

— І з жонкай усё ў вас добра?

— Так, — чырванеючы, адказаў ён.

— А чаму тады вырашылі патэлефанаваць? — спытала я.

— Ну, вось зайшоў неяк на сайт і вырашыў: а чаму б і не! — сарамліва працягвае Дзяніс. — Мне ваш голас спадабаўся. А зараз і вы таксама мне спадабаліся.

— Значыць вам кватэра не патрэбна?

— Не, ну я магу заязджаць, прыглядваць, калі што. Але ў мяне ў самога жыццё дзе ёсць.



Гэты фотаздымак даслаў мне адзін малады чалавек, які проста «рваўся» зняць у мяне адзін пакой.

— А кватэру такім чынам здымалі калі-небудзь?

— Не, ні разу... Я ўвогуле жонцы ніколі не здраджваў. Гэта першы раз.

### «Кватэра за інтым? Чаму б і не»

26-гадовы Ігар выглядаў значна старэйшым за свой узрост. Спартыўныя штаны і красоўкі, а таксама скураная куртка паверх світара выдавалі ў ім простага рабочага. Я крыху памылілася: ён аказаўся ахоўнікам.

— Родам я з Нясвіжа. Жыву ў Мінску, таму досыць складана і працаваць, і здымаць кватэру. Гэта каля 200 баксаў. Дарагавата для мяне. Сам я працую суткі праз двое. Не палю, не п'ю, — расказаў Ігар.

> **— Родам я з Нясвіжа. Жыву ў Мінску, таму досыць складана і працаваць, і здымаць кватэру. Гэта каля 200 баксаў. Дарагавата для мяне. Сам я працую суткі праз двое. Не палю, не п'ю, — расказаў Ігар.**

«Ну, тут хоць нейкая спроба апраўдаць гандаль сваім целам, але ўсё роўна не пераконвае», — падумала я.

— А вас не бянтэжыць, што вы будзеце здымаць кватэру ў дзяўчыны?

— Не. Я абсалютна нармальна стаўлюся да гэтага. Што тут такога?

— Значыць вас такі варыянт цалкам задавальняе?

— Безумоўна. А чаму вы пытаецеся?

Я патлумачыла, што для мяне важна ведаць матывы і г.д. Маўляў, хапае ўсякіх вычварэнцаў.

Мы сышліся на тым, што я падумаю і перазваню.

Будаўнік Антон матываваў сваё жаданне тым, што з Дзяржынска да Мінска дабірацца складана, а ў яго «пастаянныя запары з жыллём».

— Мне сорак год. Рост 190 см, вага 103 кг. Вось такі габарытны я дзядзька, — расказаў Антон. — Я не жанаты. Працую на будоўлі. А якая ў вас кватэра?

> **— Мне сорак гадоў. Рост 190 см, вага 103 кг. Вось такі габарытны я дзядзька, — расказаў Антон. — Я не жанаты. Працую на будоўлі. А якая ў вас кватэра?**

— Добрая. У цэнтры. На Берасцянскай, — маню я. — Там стары дом (не «хрушчоўка»), высокія столі і вялікія пакоі.

## ...Як я здымала

**Сярод іншых было некалькі тэлефанаванняў з прапановамі зняць кватэру за інтым мне. Падыграўшы аднаму, я пагадзілася ўбачыцца, каб ацаніць два бакі медаля.**

— А вось у мяне ёсць сябра, і калі мы разам з ім будзем вам кватэру здымаць? Вам жа ў цэнтры патрэбна? На Карла Маркса пойдзе? — тараторыў за два дні да сустрэчы ў трубку Дзмітрый. — Я, вы ведаеце, чалавек сур'ёзны. Маю і сям'ю, і сына. А вы студэнтка?

— Так, — пагаджаюся я.

— А дзе вучыцеся?

— На гістфаку БДУ. Пяты курс.

— А-а-а... Выпускны, значыць. І на колькі вам патрэбна кватэра?

— Да канца навучальнага года.

— Добра. Я дамаўляюся са сваім сябрам наконт кватэры. Ведаеце, ён вышэйшую адукацыю мае. Інстытут фізкультуры скончыў.

### «Ты ж прыстойная дзяўчына? Захворванняў у цябе няма?»

Літаральна вечарам таго ж дня Дзмітрый патэлефанаваў ізноў.

— Насця, я тут думаю, што сябра будзе здымаць нам кватэру. І яшчэ хацеў спытаць. Вы ж там прастытуцыяй не займаецеся? Ты ж нармальная прыстойная дзяўчына? Не п'еш і не паліш, я спадзяюся....

Так і хацелася сказаць: «Ага, блін! Толькі з мужыкамі рознымі за кватэру сплю!».

Але наступнае пытанне дабіла канчаткова.

— Я спадзяюся, у цябе ніякіх захворванняў няма? Ведаеш, я хачу, каб усім было добра. І табе, і мне, і сябру. Ён нармальны, сур'ёзны чалавек, з пасадай. Я — таксама. Так што нам непрыемнасці не патрэбны.

З Дзмітрыем мы змаглі ўбачыцца толькі ў панядзелак (нагадаю, што аб'яву я падала ў чацвер ноччу). Шчыра кажучы, за тры дні настойлівых тэлефанаванняў ён падаўся мне настолькі нудным, што я ўявіла гэткага тоўсценькага лысага ліслівага дзядзечку. Было непамысна...

Перад сустрэчай Дзмітрый яшчэ два разы патэлефанаваў.

— Насця, гэта ізноў я. А вы вось чаму так вырашылі, такім чынам здымаць кватэру? У вас грошай, напэўна, няма? І сітуацыя складаная дома? — выказаў здагадку ён.

— Так, — толькі і заставалася пагаджацца мне. — А ў мяне сустрэчнае пытанне: чаму вы самі вырашылі здымаць кватэру дзяўчыне за інтым?

— Ну, ты ж разумееш, мне ўжо 40 год. Жонцы таксама. Усё аднастайна. Хочацца чагосьці іншага, — кажа ён. — Групавы сэкс. Ад яго ж нікуды не дзенешся... У цябе ж досвед ёсць? А то ў мяне невялікі...

— Ёсць, — маню я.

«Бедная яго жонка», — толькі і круцілася ў мяне ў мазгах. Была вялікая спакуса даведацца яе нумар і ўсё расказаць.

### «Звяжамся яшчэ з якімі малалеткамі»

Падцягнуты мужчына з тонкімі рысамі твару ў чырвонай куртцы і з салатавым пакецікам у руках падышоў з-за рога будынку «Макдональдса», што ля станцыі метро «Пушкінская».

— Вы Насця? — усміхнуўся і сталі бачныя залатыя зубы.

Я агледзела яго. Падцягнуты, з шэранню ў валасах і тонкімі рысамі твару, у скураным абутку і цёмным світары. Тонкія рысы твару, серабрыстыя валасы... З выгляду — досыць інтэлігентны мужчына. Вось ідзе такі па вуліцы і ніколі нават і думка не закрадзецца...

— Давайце пройдземся, мне яшчэ шнур тут купіць патрэбна. Бачыце, кот пагрыз... А як гістфак? Ужо фініш? — паюнацку гарэзліва запытаўся ён.

Мы крочым да Ракаўскага кірмашу. Дзмітрый стараецца быць інтэлігентным і развязным. Аднак яго шорхаючая хада пастаянна перабівае ўсю галантнасць.

— А мяне сябра папрасіў усё ж сустрэцца. А то, маўляў, звяжамся з якімі малалеткамі.

— А што, я на малалетку падобная?

— Ну, ведаеце, у мяне сыну 17 год. А высокі... На працы ўсе пытаюцца, маўляў, на якім ён курсе. Зараз вучыцца ў тэхналагічным каледжы. І таксама думае на гістфак паступаць... Але я бачу, што ты нармальная дзяўчына. Я ж у людзях разбіраюся. Псіхалогію вывучаў. Праўда, вайсковага калектыву. Але думаю, што яна падобная да звычайнай.

### Сонечка Мармеладава і пяцёрка па філасофіі

— А чым вы займаецеся? — для ветлівасці пытаюся я.

— Пазнаёміцца хочаш? — усміхнуўся так, што сталі бачныя яго залатыя зубы. — Ну што. Вучыўся ў сувораўскім вучылішчы. Пасля паступіў у акадэмію без экзаменаў. Вучыўся добра... Па філасофіі ў мяне заўжды адны пяцёркі былі. Ды і літаратуру любіў. Чытаў шмат. Вось мне вельмі Дастаеўскі падабаецца... Памятаеш «Злачынства і пакаранне»? І Сонечку Мармеладаву?

«Ён што, паралелі праводзіць? Можа, мараль будзе чытаць і настаўляць на шлях ісцінны?» — з такімі думкамі я паглядзела на свайго суразмоўцу. Хацелася паслухаць яго аргументы. Аднак Дзмітрый так глыбока, напэўна, не задумваўся.

— Памятаеш, там пра паняцце справядлівасці? Дык вось, у «Злачынстве і пакаранні» Раскольнікаў забіў трох, пакаяўся, і яму далі шэсць год... А ў «Братах Карамазавых» Дзмітрый не сам забіў бацьку, а яго асудзілі на 20 год катаргі... Дык дзе паняцце справядлівасці?

Мы праходзім рынак, накіроўваемся да ўнівермага «Суседзі».

— А вы часта так кватэру здымаеце для студэнтак? — гляджу ў вочы Дзмітрыю.

— Ну, не так каб часта. У мяне досвед маленькі. Адзін раз была ў мяне дзяўчына, але тое даўно было. А зараз мы з сябрамі вырашылі: чаму б і не. Я залез на сайт, убачыў тваю аб'яву і адразу патэлефанаваў сябру, маўляў, ёсць такая тэма... — апускае вочы ён.

Спускаемся ўніз, каб купіць шнур.

— А колькі ён будзе каштаваць? Сямнаццаць тысяч! А чаму так дорага? Мне казалі тысячы тры-чатыры...

Дзмітрый забірае шнур.

### «Мы ўсё роўна знойдзем дзяўчыну. Рана ці позна»

— Ну, што — гарбаткі з шакаладам у мяне дома? — пытальна глядзіць на мяне Дзмітрый.

— Ой, вы ведаеце, наўрад ці, — кажу я.

— А чаму? Патрэбна, каб быў давер. Мы ж надоўга з табой разам збіраемся?

— Ну, я вельмі асцярожная дзяўчына, — кажу я, а ў галаве носіцца думка: ці мала які вычварэнец перада мной? — Давайце пасля.

— Ну, што ты так, я магу і пашпарт свой паказаць, і пасведчанне. І ў цябе абавязкова пагляджу і пашпарт, і пасведчанне! Патрэбна ж, каб давер быў! — ён ледзь стрымліваў расчараванне.

Бачна, што ўсе дамовы і перамовы наконт кватэры яму даліся з цяжкасцю...

— Вы ведаеце, у мяне ёсць пэўная тэхніка бяспекі. Я крыху баюся і саромеюся, — спакойна адказваю яму.

— А што, з двума мужыкамі не будзе страшна?!

Я маўчу. Мы ідзём да метро.

«І жонка ў цябе ёсць, і сын. Праца, грошы. Нават 200-250 баксаў лішніх у месяц знаходзіцца (на кватэру студэнтцы). І чаго табе не хапае?» — не даюць спакою думкі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

### А ШТО Ў ІХ?

**Арэнда жылля за інтым родам з Парыжа**

Ідэя здаваць кватэры не за грошы нарадзілася ў Парыжы літаральна 5-6 год таму. Жыллёвы крызіс і неверагодна высокі кошт на кватэры сталі прычынай contre cervice (так французы сталі называць арэнду кватэр за паслугі). Сярэдні кошт квадратнага метра ў Парыжы — 7300 еўра (сярэдні заробак француза-прыватніка — каля 2600 еўра). Кошт на другасным рынку жылля адпаведны. І бедныя людзі шукаюць усемагчымыя спробы знайсці дах над галавой.

Па звестках французскай газеты Liberation, аб'явы кшталту «Здам кватэру за сэкс два разы на тыдзень» з'яўляюцца пераважнымі. У Францыі, дарэчы, выйшла кніжка Лауры Д. «Маё дарагое навучанне», дзе 19-гадовая студэнтка расказвае, што вымушана была прадаваць сваё цела для аплаты арэнды. Дзяўчына сведчыла, што плата за кватэру складала 70 працэнтаў яе бюджэту.

**Сэкс за кватэру легальны ў фінаў**

У Фінляндыі contre cervice стаў цалкам легальным, піша Prian.ru. Мясцовыя паліцэйскія кажуць, што калі такія дамовы заключаюцца без пагроз і прымушэння, то ніякіх парушэнняў няма.

Адзіная ўмова, якую выстаўляюць фінскія ўлады, — двое павінны быць паўналетнімі, а дамова — адпавядаць заканадаўству. І ўсё ж паліцэйскія просяць жанчын паведамляць пра свае рашэнні, каб пазбегнуць злачынстваў. Дарэчы, прастытуцыя ў Фінляндыі дазволена, але забаронены сутэнёрства і публічны гандаль сэкс-паслугамі.

**У Маскве contre cervice набірае абароты**

У Маскве бясплатнаму жыллю прысвечаны спецыяльны сайт http://www.sdamdarom.ru. Тут, праўда, перавага ўсё ж тых, хто прапаноўвае за пражыванне канкрэтную дапамогу па гаспадарцы. Аднак колькасць інтымных аб'яў пастаянна павялічваецца.

## Сумеснае прадпрыемства «Бел-Ізаліт»



# «ДРЭННАЙ ЯКАСЦІ НЕ СХАВАЕШ І ПАД ЗЯМЛЁЙ...»








**15 ГАДОЎ ТАМУ, восенню, у дачыненні да работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі адбылася, па сутнасці, знамянальная падзея: спецыялісты гэтай гаспадаркі разам з нямецкімі спецыялістамі паклалі ў зямлю, у цеплатрасу (у Мінску, па вуліцы Адзінцова) «вечную» трубу. Каб ацаніць важнасць гэтай падзеі, нагадаем: менавіта падземная труба цеплавых сетак і сетак гарачага водазабеспячэння дастаўляе камунальнікам найбольшы галаўны боль — апошнія толькі і ведаюць, што раскопваюць ды закопваюць свае падземныя трасы. Зразумела, чаму: трубы маюць уласцівасць іржавець і, адпаведна, праз пэўны час выходзіць са строю, фантанаваць пад зямлёй. І надыходзіць гэты час звычайна праз 10—15 гадоў, словам — вельмі хутка. Ну, а колькі служыць «вечная» труба? Да 30 гадоў і болей. Вось гэта і стала адным з найбольш галоўных аргументаў, каб камунальнікі звярнуліся да адпаведнай, новай, тэхналогіі. Адным словам, у іх сёлета — свайго роду невялікі юбілей.**

**Ужо недзе праз месяц дакладна такі ж юбілей могуць адзначаць і працаўнікі сумеснага беларуска-нямецкага прадпрыемства «Бел-Ізаліт». У студзені наступнага года споўніцца 15 гадоў з дня яго заснавання, а яно, па сутнасці, і з'явілася праваднiком новай тэхналогіі, першым на рынку краіны наладзіла выпуск тых жа «вечных» труб.**

Коратка нагадаем пра асаблівасці гэтых труб і асаблівасці пракладвання цеплатрас — па ранейшай і ўжо новай, цяперашняй тэхналогіі. Цяпер гэтыя трубы для цеплатрас спачатку праходзяць на спецыялізаваных вытворчасцях спецыяльную апрацоўку: у прыватнасці, стальная труба ўстаўляецца ў поліэтыленавую, і яны наглуха схопліваюцца паміж сабой успененым поліўрэтанам. А ўжо сканструяваная такім чынам новая труба мае намнога ніжэйшую цеплаправоднасць (а значыць і намнога меншыя страты цяпла), яна да таго ж не патрабуе пры пракладванні цеплатрас абуладкавання спецыяльных, груваcткіх і надзвычай затратных, жалезабетонных каналаў (кладзецца прама ў зямлю). Пра тэрмін службы такой трубы — ужо сказана.

Такім чынам, яшчэ раз нагадаем, СП «Бел-Ізаліт» 15 гадоў таму першым у краіне наладзіла выпуск папярэдне ізаляваных (так іх называюць) труб і выступіла ў якасці ініцыятара новай, прагрэсіўнай тэхналогіі. Як адчувае сябе прадпрыемства цяпер?

Варта ўжо адразу прызнаць: нялёгка. З таго часу на рынку краіны з'явілася маса канкурэнтаў, прычым не толькі тых, хто працуе ўнутры рэспублікі, але і канкурэнтаў з Расіі, Украіны, а гэтыя, замежныя, канкурэнты маюць у сябе намнога таннейшы метал, значыць — і таннейшыя стальныя трубы. Словам, манаполія «Бел-Ізаліта» скончылася. Тым не меней, як зазначаюць тут, прадпрыемства мае свой неблагі сегмент рынку, мае сваіх заказчыкаў, прычым многія з гэтых заказчыкаў з'яўляюцца пастаяннымі партнёрамі. Сярод іх жа — такія буйныя і добра вядомыя арганізацыі, як «Мінскэнерга», «Віцебскэнерга», «Гроднаэнерга», «Метрабуд», трэст № 15 «Спецбуд» і іншыя (дарэчы, на «Бел-Ізаліце» па заказе прадпрыемстваў вялікай энергетыкі тут жа асвоілі выпуск труб вялікага дыяметру). І гэта пастаянства, безумоўна, у першую чаргу сведчыць пра адпаведнае прызнанне партнёрамі «Бел-Ізаліта» яго прадукцыі, якасных вартасцяў гэтай прадукцыі.

***

Уся вытворчасць «Бел-Ізаліта» размешчана ў адным, адносна невялікім памяшканні, у якім знаходзяцца і дзеючае абсталяванне, і ёмістасці з неабходнымі для запеньвання труб кампанентамі, і ўжо выраблены фасонныя дэталі для падземных трубаправодаў, і іншыя элементы вытворчага «пейзажу» прадпрыемства. Як адзначае намеснік дырэктара «Бел-Ізаліта» Яўген Максімовіч, у такім скопішчы даволі цяжка падтрымліваць адносны парадак, якога пастаянна патрабуе кіраўнік. Карацей кажучы — цесна, не хапае прадпрыемству вытворчых плошчаў. Тым не менш, тут нават знаходзяць магчымасці для таго, каб развівацца, магчымасці ўцiснуць на гэтыя плошчы нешта новае — зразумела, неабходнае для прадпрыемства. А ў прыватнасці, у мінулым годзе з'явілася на ім устаноўка па дробеачыстцы стальных труб (перад паступленнем апошніх на запеньванне) — трубы падаюцца ў гэту ўстаноўку па рольгангу прама са двара. Для чаго патрэбна дробеачыстка? Для лепшай адгезіі стальной трубы з пенаполіўрэтанам, для таго, каб трубы служылі як мага большы тэрмін. Дарэчы, а раней не чысцілі? «Чысцілі, але трубы пры гэтым, перад паступленнем іх на завод, спачатку накіроўваліся ў Навалельню Гродзенскай вобласці, дзе і праходзілі адпаведную аперацыю», — удакладняе Яўген Максімовіч. Зразумела, гэта выклікала лішнія выдаткі, страты па часе... На свае зусім невялікія плошчы ўцiснулі на прадпрыемстве і плазменную рэзку металу, а ўжо гэта прынесла больш рацыянальнае выкарыстанне і эканомію апошняга. Адносна не так даўно з'явілася на прадпрыемстве і ўстаноўка па стыкавай аўтаматычнай зварцы фасонных элементаў для труб вялікага дыяметра. Раней гэта аперацыя выконвалася пры дапамозе ручнога экструдзера, аўтаматыка ж дазволіла рабіць яе больш якасна.

***

Увогуле, якасці вырабаў, вытворчай акуратнасці ў рабоце на «Бел-Ізаліце» ўжо з самага пачатку ўдзялялі павышаную ўвагу (і можна меркаваць, пэўным чынам прыклалі да гэтага руку нямецкія заснавальнікі прадпрыемства) — гэткай жа павышанай застаецца адпаведная ўвага і цяпер. Так, усе аперацыі выконваюцца тут у строгай адпаведнасці з прадпісаннямі тэхналагічнай карты (вытрымкі з гэтай карты з адзнакамі «правільна» і «няправільна» нават наклейваюцца асобна на кожную дэталь — з тым, каб з належнай тэхналагічнай дакладнасцю выконвалі ўсе свае дзеянні ўжо мантажнікі цеплатрас непасрэдна на аб'ектах); зварныя швы праходзяць 100-працэнтны кантроль на дэфектаскапію; трубы — выпрабаванні на расцяганне і разрыў... «Наша палітыка ў галіне якасці зводзіцца да наступнай вельмі зразумелай высновы: «Паклалі трубу ў зямлю — і забыліся пра яе; і ўвогуле — дрэннай якасці і пад зямлёй не схаваеш», — падкрэсліваюць на прадпрыемстве. Абавязкова варта тут жа дадаць: на прадпрыемстве дзейнічае сістэма менеджменту якасці ІСО 9001, пры гэтым «Бел-Ізаліту» даверaны ўнутраны аўдыт; «Бел-Ізаліт» мае таксама сертыфікат гігіенічнай рэгістрацыі (такі сертыфікат неабходны ў сувязі з тым, што вада, якая праходзіць па трубах гарачага водазабеспячэння, можа выкарыстоўвацца ў харчовых мэтах); прадпрыемства на працягу двух апошніх гадоў выходзіла пераможцам у конкурсе «Лепшы будаўнічы прадукт года».







Бел-Изолит®



***

На «Бел-Ізаліце» ўдасканальваюць сваю прадукцыю. Добра вядома, што сістэмы цепла- і гарачага водазабеспячэння патрабуюць пры іх абуладкаванні спецыяльных кампенсатараў — для папярэджвання пашкоджанняў пры змене тэмператур, а значыць — расцягвання і сціскання трубаправодаў (гэтыя кампенсатары звычайна, на звычайных трубаправодах, маюць выгляд літары «П»). На «Бел-Ізаліце» ў мінулым годзе прапанавалі сістэму іх самакампенсацыі. Па інвестыцыйным праекце, які прапанавалі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі сумесна з Фізіка-тэхнічным інстытутам Акадэміі навук, распрацаваныя абсталяванне і тэхналогія вырабу самакампенсуючых трубаправодаў. Прасцей кажучы, на «Бел-Ізаліце» пачалі гнуць свае металічныя трубы, выпускаць іх хвалепадобнымі і ўжо потым запеньваць іх разам са знешняй поліэтыленавай трубой — абалонкай. Ідэя зразумелая: хвалі, што ўтвараюцца на металічнай трубе, і павінны браць на сябе ролю кампенсатараў. Гэта ідэя зарэгістравана як вынаходства, на яе афармлены адпаведны патэнт; аўтары вынаходства — адзін з прадстаўнікоў нямецкага заснавальніка і кіраўнік «Бел-Ізаліта» Святаслаў Абражэвіч. Нагадаем: даволі цесна на «Бел-Ізаліце», але знайшлі тут месца і для рэалізацыі гэтага цікавага праекта. Дарэчы, на прадпрыемстве збіраюцца ўвогуле адысці ад прымянення стальных труб (а таксама ад шклопластыкавых труб, якія ідуць на гарачае водазабеспячэнне) і замяніць іх на полібутэнавыя (з новага віду сыравіны). Вопытную партыю такіх труб нам паказалі. Як зазначалі тут, полібутэнавыя трубы — таннейшыя, пры гэтым яны вытрымліваюць больш высокія крытычныя параметры.

***

Ужо зазначалася: жывуць цяпер на «Бел-Ізаліце» ў цесным акружэнні канкурэнтаў. Як яшчэ змагаюцца на прадпрыемстве за месца для сваіх труб пад зямлёй (пра тое, што гэта ў першую чаргу робіцца з дапамогай якасці, — ужо зразумела)? «Зніжаем да мінімуму цану», — зазначаюць тут. А яшчэ прыводзяць факты не зусім зразумелай канкурэнцыі, або існаванне асобных умоў для асобных прадпрыемстваў, калі арганізацыі той ці іншай вобласці абавязаныя купляць трубы толькі ў «сваіх», гэта значыць толькі ў прадпрыемстваў, створаных непасрэдна ў той жа вобласці. І, зразумела, без ніякіх там тэндараў, як быццам абавязковых цяпер для ўсіх без выключэння. Аднак гэты факт патрабуе, так бы мовіць, асобнага асэнсавання.

Не схіляюць «Бел-Ізаліт» да лёгкага жыцця і яго шматлікія даўжнікі, колькасць якіх даходзіць да 40. Намеснік дырэктара Яўген Максімовіч, які, паводле яго слоў, да 30 працэнтаў свайго працоўнага часу затрачвае на выбіванне даўгоў, назваў асобных з іх. Не будзе лішнім данесці адпаведны спіс да больш шырокай грамадскасці. Такім чынам, ужо два гады не плаціць Дзяржынская жыллёва-камунальная гаспадарка (на адпаведным рахунку — 10 мільёнаў рублёў), «Бабруйскгазбуд» (адзін год і 26 мільёнаў), віцебскае ААТ «473-е ўпраўленне начальніка работ» (два гады і 23 мільёны); магілёўскі «Рэмбудмантаж» (2 гады і 34,5 мільёна), маладзечанскае ААТ «Будспадарожнік» (год і 11 мільёнаў), магілёўскае падраднае ўпраўленне спецработ (3 гады і 2 мільёны); мінскае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Цепласеткі» (3 гады і 45 мільёнаў)... Зразумела, пры такім раскладзе завінаваціліся і ў «Бел-Ізаліце», ужо сваім пастаўшчыкам. І хоць сальда крэдыту-дэбету на карысць прадпрыемства (а складае яно каля 2,5 мільярда рублёў), але віртуальныя грошы неяк зусім не грэюць калектыў.

Аднак не будзем забывацца: у «Бел-Ізаліта» невялікі юбілей. «Заказамі на бліжэйшы час забяспечаны, нядаўна выйгралі некалькі добрых тэндараў... Ну, а цяжкасці, якія сустракаюцца, як вядома, толькі загартоўваюць, ці не так?» — зазначаюць тут.

Відаць, на гэтых, увогуле аптымістычных, словах можна і закончыць, пры гэтым пажадаць калектыву мець тых жа цяжкасцяў як мага меней.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**

УНП 101107946.

### Папярэдне ізаляваныя трубы ад «Бел-Ізаліт»: НАДЗЕЙНАСЦЬ І ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

- разліковы тэрмін службы — 30 і больш гадоў;
- страты цяпла — 2—5 працэнтаў (у звычайных цепласетках — да 40 працэнтаў);
- на адным кіламетры папярэдне ізаляванай трубы за ацяпляльны сезон можна зберагчы цеплавой энергіі на 15 тысяч долараў;
- узвядзенне трубаправодаў з папярэдне ізаляваных труб вытворчасці «Бел-Ізаліт» зніжае сумарныя выдаткі на разліковы тэрмін іх службы ў 6 разоў.

* Кантрольная сістэма цэласнасці трубаправода, якая закладваецца на «Бел-Ізаліце» пры запеньванні труб, дазваляе хутка і дакладна вызначыць месца разрыву або пашкоджання трубаправода, калі гэта здарыцца.








**НА ЗДЫМКАХ:**

**1. Слесар Браніслаў БАГДАНОВІЧ за станком для фарміравання самакампенсуючых труб.**

**2. Прадпрыемства вырабляе экалагічна чыстую прадукцыю, гэта засведчана вядомым еўрапейскім знакам.**

**3. Пагрузка гатовых вырабаў для адпраўкі заказчыкам.**

**4. За станком для стыкавай зваркі вырабаў з поліэтылену зваршчык пластмасы Павел РАХАЦЭВІЧ.**

**5. Апаратчык палімерызацыі Сяргей ЗЕНЧЫК.**

**6. Сучасны рыштунак зваршчыка: шлем-маска з падачай ачышчанага фільтрамі паветра. Практыкант з мінскага прафтэхкаледжа Раман АБЛАВАЦКІ задаволены такім сучасным ахоўным камплектам.**

**7. Кантроль якасці зваркі труб ультрагукавым метадам праводзіць інжынер лабараторыі неразбуральнага кантролю Дзяніс ГАЛУЗА.**

**8. Спецыялісты па маркетынгу Галіна САНДОВА і Дзмітрый САЛДАТАЎ.**

**9. – Усе важныя ўчасткі вытворчасці знаходзяцца пад пільным вокам відэакантролю, – зазначае начальнік аховы аб'екта Мікалай СЛАБКО.**

**Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

# КВАТЭРУ ЗА ІНТЫМ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

— Давай так, мы даходзім да метро і ты вырашаеш: пагаджаешся ці не. Тады я патэлефаную свайму сябру і скажу, што тут няўпэўненасць ёсць. Калі не, дык навошта гэта? — рэзка (куды падзелася галантнасць) кажа Дзмітрый. — Мы сур'ёзныя людзі. Навошта нам такая сітуацыя?

Да метро пара крокаў...

— А па аб'яве тэлефанавалі яшчэ? — сумна пытаецца Дзмітрый.

— Так, — адказваю я.

— Ну, ясна. Ты пакуль выбіраеш, — уздыхае ён.

— Напэўна, я пайду ў метро, — паварочваю направа я.

— Ну, тваё права. Удачы табе. Хай з іншымі пашчасціць, — кажа Дзмітрый. — А мы ўсё роўна кагосьці знойдзем, таму што і грошы ёсць, і жаданне!

**Пастфактум**

### Конкурс — 45 чалавек на месца

З 19 па 23 лістапада аб'яву прагледзела 212 чалавек. Напісалі ці патэлефанавалі 45. У пераважнай большасці мужчыны і адна жанчына. Такога конкурсу я не бачыла ні на адну пасаду.

Прычым рэальная патрэба здымаць кватэру была ў 17-ці. І ўсё роўна, матыў «дарагавізна кватэр у сталіцы» не быў самым галоўным. Рашуча і беспаваротна пра высокія цэны на сталічныя кватэры заявілі толькі двое.

Калі паспрабаваць скласці агульны партрэт тэлефанаваўшых, то гэта будзе мужчына каля 28-30 год. З сярэднім прыбыткам. Ён жанаты, нават з дзецьмі. Хоча зняць кватэру ў дзяўчыны для не абавязваючых стасункаў з ёй жа. Асноўны матыў — з «жонкай стала сумна», «хочацца разнастайнасці» і г.д.

**Настасся ЗАНЬКО.**

### НАКОЛЬКІ ЗАКОННАЯ АРЭНДА ЗА ІНТЫМ?

**— Складу злачынства ў змесце такіх аб'яў няма. Тут можна ацэньваць з пункту гледжання маральна-этычных нормаў, — адказалі ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама. — Наконт таго, прастытуцыя гэта ці не... Згодна з законам, прастытуцыя — гэта прапанова інтымных паслуг за канкрэтную суму. Прычым, каб даказаць гэты факт, патрэбна ўбачыць момант перадачы грошай.**

### АД АЎТАРКІ

*Пасля першых двух дзён званкоў і сустрэч мне стала непамысна. Эсэмэскі з пачаткам кшталту «коцік», «сонейка» і г.д. сталі раздражняць.*

*І здзівіла, што ніводнага мужчыну не збянтэжыла і не прынізіла тое, што яго фактычна наймаюць для аказання сэксуальных паслуг. Бачаць у ім прастытутку мужчынскага полу.*

*Прызнацца шчыра, стойкую прышчэпку ад пошасці я атрымала. Аднак быў сярод гэтага ўсяго і пазітыўны момант.*

*Дзяніс, які ўпершыню хацеў здрадзіць жонцы, зранку патэлефанаваў наконт сустрэчы. І калі я сказала, што не бачу сэнсу сустракацца, ён задумліва сказаў:*

*— Напэўна, не лёс. Напэўна, не патрэбна мне здраджваць сваёй жонцы.*

*— Дакладна, не лёс. Я на 100 працэнтаў ведаю, — адказала я.*

**Каментар псіхолага:**

**Андрэй МЯЦЕЛЬСКІ, псіхатэрапеўт:**

### «У БЕЛАРУСІ З'ЯВІЛАСЯ МУЖЧЫНСКАЯ ПРАСТЫТУЦЫЯ»

Што тычыцца сітуацыі «я здаю кватэру, а за гэта атрымліваю паслугі інтымнага характару», існуюць некаторыя гендарныя адрозненні. Іншымі словамі, варыянты здачы кватэры за інтым жанчынай і мужчынам будуць розныя.

У мужчынскай псіхалогіі (я маю на ўвазе цяпер не ўсіх мужчын, але, на жаль, мабыць, большасць) знайсці прыгоды «збоку», ці нават проста, за адсутнасцю штампа ў пашпарце, завесці адносіны на інтымнай глебе — і толькі на ёй — вельмі прывабна. Прычынай гэтаму, мабыць, мужчынскі інфантылізм. Будаваць адносіны сумленна і адкрыта азначае для іх пэўны ўзровень адказнасці. На які — на жаль! — яны не здольныя.

Бо насамрэч вельмі і вельмі шмат хто шукае цяпер дзяўчат, з якімі проста можна рэалізаваць сэксуальныя фантазіі, не будучы пры гэтым адносін, не думаючы пра дзяцей, пра тое, як пракарміць сям'ю ў будучыні і г.д. Яны гатовыя нават, пры наяўнасці грошай, плаціць самі.

А ўжо такі варыянт, як знайсці палюбоўніцу, ды яшчэ і атрымаць у дадатак часовую жылплошчу, задавальняе ой як многіх!

У выпадку, калі б падобную аб'яву даваў мужчына, былі б адрозненні, галоўным чынам у матывацыі. Шмат якія дзяўчаты шукаюць спонсараў. Часцей гэта тыя, хто меў негатыўны досвед адносін. А гэта значыць — ужо страціў надзею здабыць бяспеку звычайнымі спосабамі.

Што я маю на ўвазе? Для дзяўчыны важна (і, мабыць, на першым месцы, пры стварэнні сям'і), каб мужчына падтрымліваў бяспеку. Гэта значыць матэрыяльны ўзровень для выжывання і псіхалагічнае пачуццё «надзейнага пляча, на якое можна абаперціся заўсёды».

Калі з тых ці іншых прычын у дзяўчыны ўзаемаадносіны не складваюцца, яна можа прыняць рашэнне або дасягнуць усяго самой (як вынік — бізнэс-лэдзі), або знайсці сабе фундатара (па прынцыпе «з грашыма прасцей быць у бяспецы»). Так што калі б вы, Настасся, былі мужчынам, на вашу аб'яву зрэагавала б менавіта апошняя катэгорыя дзяўчат.

Наконт мужчын, якія няправільна зразумелі вашу прапанову. Звычайна гатовыя здымаць кватэру дзяўчыне за інтым псіхалагічна пакутуюць ад дзвюх асноўных праблем.

Па-першае, гэта зноў-такі непрыняцце адказнасці. Не тое што за чужое жыццё (бо пра сем'і яны не думаюць у той час, калі вырашаюцца паспрабаваць групавы сэкс), але і за сваё. Бо толькі адзін, заўважце, хутчэй за ўсё неўротык, пацікавіўся адсутнасцю/наяўнасцю ў вас венерычных захворванняў. Па-другое, упэўнены ў сабе мужчына ніколі, нават калі не атрымоўваецца схіліць да сваіх фантазій жонку, не стане плаціць за сэкс. Няхай гэта будуць грошы ці кватэра. Выснова наконт комплексу непаўнавартаснасці напрошваецца неяк сама сабой..

Усё апісанае ў вашым артыкуле прымушае засумавацца. Насамрэч прычыны і карані таго, што многія сёння гатовыя плаціць (ізноў-такі не важна, якім чынам) за адносіны (рамантычныя, сэксуальныя) — у адсутнасці адвагі і ўпэўненасці ў сабе як у асобы, здольнай зацікавіць сабой, а не матэрыяльнымі выгодамі.

Вось «нарэшце» ў Беларусі, як даўно ўжо ў «благаслаўлёнай Еўропе», з'явілася мужчынская прастытуцыя. Пакуль яшчэ няўпэўненая ў сабе, утоеная, сціплая. Але хутка па абочынах магістраляў разам з «дзяўчаткамі — плечавымі» будуць стаяць «мужычкі — плечавыя».

**Ведай нашых!**

## У ФІНАЛЕ ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ — ПРАГРАМІСТЫ БДУ

**Каманда Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — адзіная з Беларусі — здолела прабіцца ў фінал студэнцкіх спаборніцтваў чэмпіянату свету па праграмаванні.**

Тройка фіналістаў складаецца з выхаванцаў факультэтаў прыкладной матэматыкі і інфарматыкі ўніверсітэта. Перамогу ў паўфінале, які праходзіў у Санкт-Пецярбургу, святкавалі трэцякурснікі гэтага факультэта Юрый Пісарчык і Раман Удавічэнка, а таксама магістрант Дзяніс Ярац. Права на ўдзел у фінале яны заваявалі, рашыўшы за пяць гадзін 8 задач з 11 прапанаваных. Трэба заўважыць, што высокі вынік — 8 задач, якія давалі права выхаду ў фінал, — паказала і другая каманда студэнтаў ФПМІ. Аднак, згодна з умовамі правядзення спаборніцтваў, прадстаўляць ВНУ можа толькі адна каманда.

Яшчэ дзве каманды БДУ заваявалі 28 і 44 месца, рашыўшы 6 і 5 задач адпаведна. Дзве каманды БДУІР апынуліся на 36 і 59 месцы (рашылі 6 і 4 задачы адпаведна). У каманды Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта — 76 месца... Фінал чэмпіянату свету па праграмаванні адбудзецца ў лютым 2011 года ў Егіпце. Тут сустрэнуцца лепшыя студэнцкія каманды 100 універсітэтаў з 90 краін свету.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Акцыі**

## СТУДЭНЦКІ ПРАФСАЮЗ — ГЭТА СІЛА

**Акцыю «Студэнцтва і прафсаюзы разам» арганізаваў для прафсаюзных актывістаў з кола першакурснікаў сталічных ВНУ Цэнтральны камітэт Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі. У яе рамках адбыўся таксама злёт стыпендыятаў ЦК галіновага прафсаюза.**

— У рабоце з навучэнскай і працоўнай моладдзю Беларускі прафесійны саюз работнікаў адукацыі і навукі, як і Міністэрства адукацыі , і прафсаюзы, што ўваходзяць у склад Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, лічыць адной з галоўных задач выхаванне адказнасці ў моладзі за свае ўчынкі, і вельмі важна, што гэта супадае з пажаданнямі бацькоў, — падкрэсліў на сустрэчы з моладдзю лідар галіновага прафсаюза Аляксандр Бойка.

Кульмінацыяй акцыі стала сумеснае мерапрыемства ЦК прафсаюза, Міністэрства адукацыі і Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, якое адбылося ў Цэнтральным Доме афіцэраў. Там была арганізавана прэзентацыя дзейнасці пярвічных прафсаюзных арганізацый студэнтаў ВНУ, прагляд спектакля «Сымон-Музыка», а таксама прайшло ўшанаванне стыпендыятаў. А днём раней адбыўся «круглы стол» на тэму «Студэнцтва і прафсаюз: перспектывы ўзаемадзеяння». Усяго ўдзел у акцыі ўзялі больш як 900 студэнтаў-актывістаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».**

**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**
**Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**
**Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**
**Кантактны тэлефон: 292-44-12.**
**e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by**
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.**

# МІНЧАНІН ІЛЬЯ ЧЫЖОЎ СКЛАЎ БЕЛАРУСКІ АЛФАВІТ З МІНСКІХ БУДЫНКАЎ!

**Малады архітэктар разгледзеў праз спадарожнік, што ў сталіцы ёсць нават «апостраф» ды «і» з кропачкай**

***У мінулым нумары мы змясцілі фотаздымкі аб'ектаў, дзе прачытваюцца літары ад А да Ж, а сёння заканчваем алфавіт.***


**З** Будынак у раёне Нацыянальнай бібліятэкі


**І** Новы гандлёвы цэнтр на скрыжаванні каля ўніверсама «Рыга»


**Й** Дом па вуліцы Магілёўскай


**К** Скрыжаванне Карбышава-Цікоцкага


**Л** Вадаём у Шабанах


**М** Дом ля цырка


**Н** Школа па вуліцы Цікоцкага


**О** Плошча Перамогі


**П** Новыя дамы па вуліцы Пінерскай


**Р** Раён вуліцы Брэст-Літоўскай


**С** Дом на плошчы Бангалор


**Т** Скрыжаванне вуліцы і завулка Вясніна ў раёне вадасховішча Дразды


**У** Рэстаран «Белая Вежа»


**Ў** Будынак каля аэрапорта «Мінск-1»


**Ф** Вельмі характэрны мост з «адгалінаваннем» на вуліцы Маскоўскай


**Х** Ракаўскае прадмесце


**Ц** Раён вуліцы Кальцова


**Ч** Раён вуліцы Ясеніна


**Ш** Квартал па Свярдлова—Кірава, будынак БДЭУ


**Ы** Дамы на вуліцы Гамарніка


**Ь** Дамы насупраць Нацыянальнай бібліятэкі


**Э** Аўтобусная станцыя ля станцыі метро «Магілёўская»


**Ю** Оперны тэатр


**Апостраф** Раён «Усход» па праспекце Незалежнасці


**Я** Раён вуліцы Корш-Сабліна

## ІНТЭРАКТЫЎ!




А якія літары ці цікавыя выявы ёсць у вашым горадзе ці мястэчку?

Скажам, у Наваполацку ёсць цэлы мікрараён у выглядзе надпісу «СССР». А ў Іванаўскім раёне даследчык Андрэй Дыбоўскі пабачыў са спадарожніка вось такі незвычайны лес! Далучыцца да пошуку літар і цікавостак нескладана. Для гэтага трэба зайсці на сайт http://maps.google.com, увесці ў пошук назву свайго населенага пункта — і наперад!

Свае цікавосткі дасылайце на адрас электроннай пошты sidezv@gmail.com або labadzenka@gmail.com

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**



## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.04 | 15.52 | 7.48 |
| Віцебск — | 8.01 | 15.35 | 7.34 |
| Магілёў — | 7.55 | 15.42 | 7.47 |
| Гомель — | 7.44 | 15.47 | 8.03 |
| Гродна — | 8.18 | 16.09 | 7.51 |
| Брэст — | 8.11 | 16.17 | 8.06 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 28 лістапада. Месяц у сузор'і Шаляў.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Мікалая, Платона, Рамана.*
***К.*** *Наталлі, Эдмунда, Элігіума.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.






## Дзве даты — 1 снежня

**1903 год** — у Вільні адбыўся 1-ы з'езд Беларускай сацыялістычнай грамады — першай беларускай нацыянальнай палітычнай партыі. Ставіла разам з патрабаваннямі сацыялістычных пераўтварэнняў пытанне аб нацыянальна-культурнай аўтаноміі (пазней — уласнай дзяржаўнасці) для беларусаў. Ініцыятарамі стварэння партыі выступалі вядомыя дзеячы беларускага адраджэння Алесь Бурбіс, браты Луцкевічы, Алаіза Пашкевіч (Цётка) і іншыя.



**1934 год** —у Ленінградзе, у Смольным, па дарозе ў свой рабочы кабінет быў застрэлены Кіраў. Існуюць версіі прамога ці ўскоснага дачынення да гэтага Сталіна, але доказаў таму няма. Тым не менш, лічыцца, што забойства кіраўніка ленінградскай партыйнай арганізацыі стала нагодай для развязвання ў краіне масавых палітычных рэпрэсій.

## Цытата дня:

***«Кожны дурань ведае, што да зорак не дастаць, але разумныя, не звяртаючы на гэта ўвагі, усё роўна спрабуюць».***

**Герберт Лоўрэнс Андэрсан, амерыканскі фізік.**

## Будзь у курсе!

# Каб злавіць шчасце ў Год Труса, трэба ўмець бегаць

**У адным з папярэдніх нумароў астролаг Уладзімір ВАСЮК расказаў нашым чытачам пра агульныя характарыстыкі Года Труса (Ката). Сёння мы больш падрабязна пагаворым пра тэндэнцыі ў асабістым жыцці, якія атрымаюць развіццё ў 2011 годзе.**



— Падзеі ў асабістым жыцці ў Год Ката будуць развівацца вельмі хутка і імкліва. Часу на роздум перад прыняццем адказных рашэнняў будзе мала. У неакальцаваных асоб, якія яшчэ не абраліся шлюбам і пакуль што не збіраюцца туды, наступны год будзе напоўнены шматлікімі раманамі і процьмай магчымасцяў пабудаваць трывалыя адносіны. Увогуле, 2011 год — гэта год ВЯЛІКАГА І РАЗНАСТАЙНАГА ВЫБАРУ, год ВЯЛІКІХ МАГЧЫМАСЦЯЎ У АСАБІСТЫМ ЖЫЦЦІ. Для многіх свабодных мужчын і жанчын гэта будзе час ПРАБЛЕМЫ ВЫБАРУ, бо варыянтаў на любоўным гарызонце з'явіцца багата.

Такім чынам, у асабістым жыцці сітуацыя будзе развівацца дынамічна і запатрабуе аператыўнага прыняцця рашэнняў, адкрыюцца новыя перспектывы.

Для таго, каб дынаміка ў справах сардэчных была станоўчай, а не адмоўнай, вельмі важна захоўваць пазітыўны настрой і быць шчырым з самім сабой, не выдаваць чужыя, навязаныя жаданні за свае (гэта самая вялікая небяспека на шляху да шчасця ў каханні ў Год Труса, якая можа «выліцца» ў адсутнасць паразумення з прадстаўнікамі процілеглага полу і замаруджваннем усіх працэсаў на любоўным фронце). Перад тым, як пачаць будаваць асабістыя адносіны, спачатку варта як след разабрацца ў сваіх памкненнях, дакладна ўсвядоміць, што канкрэтна вам неабходна для шчасця. І тады перамены да лепшага не прымусяць сябе доўга чакаць. Кожны ў Год Ката атрымае роўна столькі, колькі яму насамрэч патрэбна.

Яшчэ адна парада ад зор: паколькі і Кот, і Трус — жывёлы рухомыя, поспеху ў каханні лягчэй дасягнуць тыя, хто не стане пасіўна чакаць перамен. Каб злавіць шчасце, трэба ўмець бегаць.

Маладым людзям, якія толькі пачынаюць спрабаваць наладзіць стасункі з процілеглым полам, астролаг раіць не баяцца магчымых няўдач і праяўляюць актыўнасць. Як бы ў выніку ні склалася сітуацыя, раманы 2011 года пакінуць яскравы запамінальны след.

Тыя, хто ўжо знайшоў сваю пару і працягвае развіваць адносіны, павінны памятаць, што ў Год Труса маюць значэнне не словы, а справы. Ацэньвайце свайго мілага па яго ўчынках, а не па намерах і гучных заявах. Гармоніі ў асабістым жыцці ў 2011 годзе дапаможа дасягнуць адмова ад эгаізму і больш уважлівае стаўленне да патрэб і жаданняў партнёра. У Год Ката важны не толькі пачуцці, але надзейнасць, адказнасць. Каб праверыць, чаго варты ваш абраннік, можна змяніць абстаноўку, з'ездзіць з ім за мяжу, ці хаця б часцей хадзіць у госці. Нязвыклыя абставіны абавязкова праявяць сутнасць характару чалавека.

2011-ы — спрыяльны год для абрання шлюбам, для завязвання сур'ёзных адносін. У Год Труса не патрабуецца шмат часу для таго, каб зразумець — ваш гэта чалавек, ці не, ёсць перспектывы ў рамана, ці не.

У шлюбе вялікае значэнне будзе мець гатоўнасць кожнага з партнёраў узяць на сябе частку абавязкаў другога. Год запатрабуе ад мужоў і жонак пэўнага ахвяравання дзеля захавання гармоніі ў сям'і. Для некага гэта будзе час, для іншага — грошы. Камусьці давядзецца праяўляць больш пяшчоты і клопату да сваіх блізкіх, а хтосьці будзе вымушаны адмовіцца ад дрэннай звычкі.

Лягчэй дасягнуць перамог на любоўным фронце ў Год Ката атрымаецца ў вогненных знакаў задыяка — Авенаў, Ільвоў і Стральцоў. Больш складанасцяў чакае Шаляў і Ракаў, бо яны схільныя доўга абдумваць усе свае крокі і могуць упусціць свае шчаслівыя шанцы. У астатніх знакаў моцных узрушэнняў у рамантычнай сферы зоры не прагназуюць.

Чаго не трэба рабіць у 2011 годзе, дык гэта ахвяраваць сваімі прынцыпамі на карысць перспектывы рамантычных прыгод, доўга вагацца і марудзіць перад прыняццем рашэння.

### Вайна палоў — ёсць шанц знайсці кансенсус

У Год Труса прыгожы пол павінен настроіцца на актыўныя дзеянні, і самастойна, сваімі прыгожымі вытанчанымі ручкамі каваць сваё жаночае шчасце. Толькі спачатку трэба разабрацца ў сабе, вызначыць свае станоўчыя якасці, палюбіць сябе — такую выключную, непаўторную — і потым рушыць заваёўваць мужчынскія сэрцы.

Ідэальным іміджам для жанчын у 2011 годзе будзе прастата і даступнасць для ўспрымання. Вычварнасць і шматслойнасць у адзенні забараняецца! Мужчыны — у масе сваёй натуры немудрагелістыя, яны не вельмі разбіраюцца ў нюансах жаночых убораў. Не ўскладняйце ім (і сабе) задачу разгледзець усё тое прывабнае, чым вас адарыла прырода і бацькі. Залішне агаляцца, вядома ж, не варта, але і перагружаць свой гардэроб аксесуарамі, стракатымі тканінамі і складаным фасонам не трэба.

Першая палова 2011 года — час прамалінейнасці, адпаведна ў адзенні лепш аддаць перавагу простым лініям, чыстым колерам, дакладным сілуэтам, якія падкрэсляць жаночыя формы, і пры гэтым пакінуць адчуванне цэласнасці вобраза. Ніякіх мужчынскіх касцюмаў і ўнісэксу! Вы — жанчына, і адзенне павінна гэта падкрэсліваць (але гэта не значыць, што трэба апранацца як прадстаўніца старэйшай прафесіі, пачуццё густу ніхто не адмяняў).

Паводзіны жанчын у Год Труса павінны адпавядаць іх адзенню. Прастата і зразумеласць павінны выціснуць загадкавасць, бясконцыя намёкі і халодную адасобленасць. Вобраз «загадкавай феі» цяпер не ў модзе. Жанчыны павінны набрацца рашучасці і адкрыта праяўляць свае жаданні і намеры адносна мужчын. Калі прагнеце лёгкага флірту без абавязкаў — дэманструйце гэта паводзінамі і адзеннем. Калі настроіліся на пошук спадарожніка жыцця, з якім можна будзе адзначыць залатое вяселле, — манеры і вобраз павінны адпавядаць вашай ідэі.

У другой палове года дамінуючую ролю ў паспяховым будаванні асабістага жыцця будзе іграць жаночая натуральнасць і ўменне ствараць вакол сябе атмасферу ўтульнасці і камфорту. Мужчыны паляцяць да вас, як пчолы на мёд.

Жанчынам, якія яшчэ не паспелі абрацца шлюбам, зоркі раяць перагледзець свае патрабаванні, якія прад'яўляюцца да патэнцыяльных жаніхоў, і выбраць з таго, што маеце ў наяўнасці. Хопіць ужо сядзець у дзеўках. А ў замужніх дам у 2011 годзе з'явіцца ўнікальны шанц сваімі настойлівымі і мэтанакіраванымі намаганнямі змяніць у лепшы бок нават самыя складаныя адносіны з мужам.

Мужчынам у плане моды варта аддаць перавагу стрыманасці, акуратнасці і функцыянальнасці. Як і ў жаночым гардэробе, асабліва цаніцца будзе прастата і цэласнасць вобразу.

Ад мужчын 2011 год запатрабуе адказнасці ў рамантычных стасунках. Энергетыка года будзе спрыяць моцнаму полу знаходзіць ключы да жаночых сэрцаў, але за ўсе свае амурныя паходжанні і флірты мужчынам прыйдзецца трымаць справаздачу перад сімваламі года. Ні яны, ні самі заваяваныя аб'екты любоўнай вайны не даруюць грэбавання інтарэсамі жанчын. І чым больш іх будзе ў кожнага лавеласа, тым мацнейшы галаўны боль ён сабе забяспечыць. Адназначна, новы год «казаноў» не парадуе, нягледзячы на тое, што выбар для заваявання будзе выключна багатым.

На першым этапе рамантычных зносін у 2011 годзе мужчынам трэба сур'ёзна ўзважыць усе за і супраць, бо потым разарваць гэтыя адносіны будзе вельмі цяжка.

У Год Ката мужчынам трэба навучыцца браць на сябе адказнасць за рамантычныя зносіны. Калі мужчына гатовы да сур'ёзных трывалых адносін, яны хутка акрэсляцца. Настае спрыяльны час для рэгістрацыі шлюбу і нараджэння дзяцей. Сімвалы года вас падтрымаюць.

Жанатыя мужчыны ў 2011-м будуць выступаць у нязвыклай для сябе ролі — захоўнікаў хатняга ачага. Яны будуць займацца планаваннем будучага сям'і, улічваючы перспектывы развіцця сітуацыі. А жанчыны выйдуць на першы план у публічным жыцці грамадства, будуць самасцвярджацца ў палітыцы, эканоміцы, праве. Такім чынам, 2011-м стане годам змены роляў. І ў многім гэта абумовіць большае паразуменне паміж поламі, лёгкае знаходжанне кансенсусу.

У наступных нумарах мы больш падрабязна пагаворым пра дабрабыт і фінансы ў 2011 годзе.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

## Усміхнемся!

**Прадам сабаку, ведае ўсе каманды. Можа з ходу назваць, хто выйграў ва ўругвайскім чэмпіянаце 1962 года.**

☺

Заняткі ў аўташколе. Выкладчык:

— Такім чынам, для чаго ж служаць дарожныя знакі?

Голас з аўдыторыі:

— Для адбірання ў кіроўцаў грашовых знакаў.

☺

**Спачатку піва было проста напоем. Пасля таго, як піва акружылі гледачамі, з'явіўся тэатр. Затым піва акружылі пасажырамі — з'явіўся вакзал. Такім жа спосабам былі створаны лазня, пляж і г.д.**

☺

— Афіцыянт, нейкі ў вас біфштэкс сыры!

— Затое хлеб сухі!

☺

**Разумны мужчына імкнецца не даваць жанчыне прычыны для таго, каб крыўдзіцца.**

**Разумнай жанчыне для таго, каб пакрыўдзіцца, прычыны не патрэбныя.**

☺

— Ваш муж зноў заліў суседзяў!

— Ну, у гэтым няма нічога дзіўнага...

— Так?! Тры паверхі ўгару персікавым сокам?!




## НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў СНЕЖНІ

02.12, чацвер 10.10 — 16.44;
04.12, субота 14.15 — 20.00;
06.12, панядзелак з 23.16 да канца дня;
07.12, аўторак да 1.16;
09.12, чацвер 3.10 — 9.30;
11.12, субота 13.10 — 20.40;
14.12, аўторак 2.35 — 9.14;
16.12, чацвер13.40 — 20.50;
18.12, субота з 23.37 да канца дня;
19.12, нядзеля да 5.37;
21.12, аўторак 10.15 — 11.22;
22.12, серада 14.00 да канца дня
23.12, чацвер 9.25 — 14.50;
25.12, субота 11.30 — 17.15
27.12, панядзелак 14.20 — 19.37.

**Открытое акционерное общество «Витебский приборостроительный завод»**
**извещает своих акционеров (представителей) о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 16 декабря 2010 года в 14.00 по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, д. 4 (Клуб завода).**

**Повестка дня:**
1. О внесении изменений в Устав Общества.

Регистрация участников собрания — с 13.00 до 13.45.
Для регистрации акционерам при себе иметь паспорт, представителям — доверенности.

УНП 300048171 **Наблюдательный совет.**



Дарагога, любімага сыночка, брата, дзядзьку **Мікалая Сяргеевіча ЛЯЎКОЎСКАГА** віншуем з 30-годдзем. Жадаем здароўя, дабрабыту і ўсіх зямных даброт.

З любоўю **мама, тата, брат з жонкай і пляменнік Віталік.**

Любую матулю, бабулю і прабабулю **Марыю Васільеўну МІХАЙЛОЎСКУЮ** з в. Танаўшчына віншуем з 75-гадовым юбілеем. Моцнага здароўя, даўгалецця, далейшых поспехаў падпісчыцы газеты «Звязда» і ўсіх зямных даброт.

**Дзеці, унукі, праўнукі.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 5848. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12